Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ВЫНІКІ АНЛАЙН-АПЫТАННЯ: ВЫСОКІ ДАВЕР ДА ЎЛАДЫ 6



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

19 СНЕЖНЯ 2024 г. ЧАЦВЕР № 247 (30381)



# Дзеля доўгатэрміновага стратэгічнага супрацоўніцтва

**Блізкаўсходняя камандзіроўка Прэзідэнта Беларусі працягваецца. Правёўшы яшчэ адны важныя перагаворы ў Амане, Аляксандр ЛУКАШЭНКА ў той жа дзень накіраваўся з візітам у Аб'яднаныя Арабскія Эміраты** (стар. 2)

## Чым здзівіць Мінскі міжнародны выставачны цэнтр?




# Пад крыламі бусла

**Унікальны культурны аб'ект і найбуйнейшы ў краіне экспазіцыйны комплекс пачне работу ў найбліжэйшы час. Тут будуць праходзіць выставы і канферэнцыі, канцэрты і бізнес-сустрэчы, культурныя і масавыя мерапрыемствы.**

СТАР. 7



Вечныя каштоўнасці

# «ЖЫВЁМ ПРАДЧУВАННЕМ НАВАСЕЛЛЯ»

**У сям'і Арэхавых растуць тры дачкі і тры сыны, тут любяць музыку, навучаюць дзяцей дабрыні і спагадзе, будуюць дом мары**

**Цяпер у сям'і Арэхавых рыхтуюцца да калядных свят. Ёлку гэтым разам купілі ў кадушцы з прыцэлам на тое, што на пачатку вясны перасадзяць дрэва на свой участак. Калі ёлка падрасце і ўбярэцца ў сілу, яе будуць прыбіраць у двары ўсе разам. А пакуль на адмысловым стэндзе ў пярэднім пакоі дзеці знаходзяць розныя невялічкія заданні, звязаныя з будучымі святамі, а потым за іх выкананне атрымліваюць маленькія падарункі. Такая ў іх традыцыя.**

### ГІСТОРЫЯ І ТРАДЫЦЫІ

Гісторыя гэтай сям'і налічвае 12 гадоў, а традыцый ужо нямала. І галоўная з іх — атмасфера любові, узаемапавагі, узаемадапамогі, атмасфера, якая вырашае ўсё. Аўтар гэтых радкоў упершыню пачула пра сям'ю Арэхавых ад настаўніцы, у якой вучыцца адна з дачок. Дык вось педагог адзначыла ў ёй рэдкую рысу сучасных дзяцей — дабрыню. Сказала, што дзеці ў гэтай сям'і растуць, апроч іншага, добрымі.

Маці вялікага сямейства Таццяна Арэхава гаворыць, што яны сям'я веруючая, жыць стараюцца па божых запаведзях, дзецям змалку чытаюць адпаведныя кнігі, добрыя казкі, павучальныя гісторыі. Карыстанне сучаснымі гаджэтамі абмяжоўваюць. А яшчэ для дзяцей прыкладам з'яўляюцца ўзаемаадносіны бацькоў. Тут прынята адказна ставіцца да любой справы, радавацца поспехам адно аднаго, жыць на пазітыве.

СТАР. 8-9

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Ідзе падпіска на I квартал і I паўгоддзе 2025 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2025 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



# Дзеля доўгатэрміновага стратэгічнага супрацоўніцтва

Гэты тыдзень, дый увогуле найбліжэйшы час, у Прэзідэнта Беларусі будзе насычаны замежнымі візітамі і важнымі сустрэчамі. Яшчэ ў першыя дні візіту ў Аман міністр замежных спраў Беларусі Максім Рыжанкоў у эфіры «Беларусь 1» прыадкрыў графік міжнародных візітаў кіраўніка дзяржавы. Максім Рыжанкоў зазначыў, што ў Аляксандра Лукашэнкі будзе яшчэ некалькі цікавых візітаў да выбараў. Вельмі насычаны міжнародны парадак дня чакаецца і пасля правядзення выбарчай кампаніі. «Крыху падзакрыты сёння толькі еўрапейскі рэгіён для нашай дзяржавы. Усе астатнія рэгіёны чакаюць, і мы, уласна кажучы, праводзім падрыхтоўчыя мерапрыемствы па паездцы Прэзідэнта туды, — расказаў міністр. — Гэта нашы найбліжэйшыя партнёры, з якімі мы наладжваем доўгатэрміновае стратэгічнае супрацоўніцтва». Аляксандр Лукашэнка — даволі часты госць на Вялікім Блізкім Усходзе і з многімі лідарамі рэгіёна мае проста бліскучыя адносіны. Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Катар, Іран, Пакістан, Егіпет — у гэтым спісе ўжо, без сумненняў, будзе значыцца і Аман — візіт у гэту краіну адбыўся па запрашэнні Султана Хайсама бен Тарэка Аль Саіда. Насуперак санкцыям і знешняму націску калектыўнага Захаду Беларусь толькі ўмацоўвае сваё міжнароднае супрацоўніцтва, планамерна пашыраючы колькасць партнёраў на далёкай дузе. І блізкаўсходняе турнэ беларускага лідара — самае яскравае таму пацвярджэнне.



Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка правёў перагаворы з дзяржаўным міністрам знешняга гандлю ААЭ Тані Бен Ахмедам Аль Заюдзі.

## УЗАЕМНЫ ІНТАРЭС У МНОГІХ СФЕРАХ

Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыбыў з працоўным візітам у Аб'яднаныя Арабскія Эміраты. Беларускі борт нумар адзін прызямліўся ў аэрапорце Абу-Дабі.

Адразу ў аэрапорце Аляксандр Лукашэнка правёў перагаворы з дзяржаўным міністрам знешняга гандлю ААЭ Тані Бен Ахмедам Аль Заюдзі.

«Дзякуй за вашу гасціннасць. Я хацеў бы за некалькі дзён тут абмеркаваць шэраг пытанняў нашых адносін, сустрэцца з інвестарамі, якія працуюць у Беларусі, інвестуючы ў нашу эканоміку», — расказаў аб дэталях свайго візіту кіраўнік дзяржавы.

У праграме візіту — шэраг сустрэч і перагавораў. У ходзе іх правядзення асноўная ўвага будзе ўдзелена прадаўжэнню і развіццю супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай, інвестыцыйнай, гуманітарнай і іншых сферах, якія маюць узаемны інтарэс.

## ПРАЦАВАЦЬ РАЗАМ ДЛЯ ДАСЯГНЕННЯ АГУЛЬНЫХ МЭТ

А да вылету ў Абу-Дабі Аляксандр Лукашэнка правёў яшчэ адну важную сустрэчу ў Маскаце. Намеснік Прэм'ер-міністра па справах Савета міністраў Султаната Аман Саід Фахад бен Махмуд Аль Саід — другая асоба ў дзяржаве.

Падчас сустрэчы беларускі лідар коратка падвёў вынікі свайго візіту: «Мы фактычна з Султанам вызначылі план нашых дзеянняў. Мы стварылі міжурадавую камісію і з учарашняга дня пачалі выпрацоўваць дарожную карту — план нашых дзеянняў. У сярэдзіне наступнага года Султан Амана прыедзе ў Беларусь. Мы гэту карту дарожную і план зацвердзім».

Ён адзначыў, што да гэтага будуць рэалізоўвацца практычныя мерапрыемствы і захады ў супрацоўніцтве Беларусі і Амана ў галіне эканомікі.

## Учора ў вядучых аманскіх СМІ была апублікавана сумесная заява лідараў дзвюх краін



Фота БелТА.

Прэзідэнт Беларусі і Султан Амана выказалі сваю рашучасць працаваць разам для дасягнення агульных мэт і пабудовы адносін на аснове ўзаемнай павагі і разумення. Бакі высока ацанілі ўмацаванне двухбаковых кантактаў і падкрэслілі важнасць паглыблення партнёрства ў эканамічнай, палітычнай і культурнай галінах. У якасці сфер для пашырэння партнёрства вызначаны чыстая энергія, турызм, адукацыя, ахова здароўя, тэхналогіі, транспарт і лагістыка.

**Абодва бакі віталі двухбаковыя намаганні па актывізацыі супрацоўніцтва ў галіне прамысловасці, уключаючы сумесныя праекты па зборцы тэхнікі ў Амане.**

**Лідары заклікалі да супрацоўніцтва ў галіне сельскай гаспадаркі і харчовай бяспекі.**

**Бакі віталі паспяховыя перагаворы на выставе Oman AgroFood 2024 і выказалі падтрымку сумесным праектам у сферы дзіцячага харчавання і малочнай прадукцыі.**

**Абедзве краіны дамовіліся, што іх адпаведныя органы вывучаць магчымасць стварэння і напрамкі работы беларуска-аманскага камітэта для падтрымкі сумесных ініцыятыў.**

**Беларусь вітала ўвядзенне палегчанага візавага рэжыму ў дачыненні да беларускіх грамадзян для паездак у Аман тэрмінам да 14 дзён. Бакі абмеркавалі магчымасць арганізацыі прамых рэйсаў паміж Беларуссю і Аманам і пагадненне аб узаемнай адмене віз.**

**Прэзідэнт і Султан абмяняліся думкамі па рэгіянальных і міжнародных пытаннях, пацвердзіўшы сваю павагу міжнароднага права і Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, падкрэсліўшы важнасць супрацоўніцтва ў рамках міжнародных арганізацый для забеспячэння міру і бяспекі.**

Дэлегацыі абодвух бакоў правялі сустрэчы, каб абмеркаваць стратэгіі развіцця сваіх краін і намеціць шляхі, з дапамогай якіх яны могуць стымуляваць двухбаковы гандаль і інвестыцыі, і больш цесна супрацоўнічаць па такіх глабальных пытаннях, як харчовая бяспека.

Прэзідэнт Беларусі выказаў падзяку за цёплы прыём і запрасіў Султана наведаць Беларусь.

# НЕ ПРОСТА РАЗМОВЫ, А КАНКРЭТНЫЯ ДАМОЎЛЕНАСЦІ

## Прадстаўнікі ўрадаў Беларусі і Амана ў Маскаце ў рамках візіту Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі падпісалі дакументы аб супрацоўніцтве і адпрацавалі дарожныя карты па галінах

**Падпісаны мемарандум аб узаемаразуменні паміж Міністэрствам прамысловасці Беларусі і Міністэрствам гандлю, прамысловасці і садзейнічання інвестыцыям Султаната Аман у галіне прамысловага супрацоўніцтва. Таксама бакі змацавалі подпісамі мемарандум аб узаемаразуменні паміж гэтым жа ведамствам Амана і Дзяржаўным камітэтам па стандартызацыі Беларусі ў галіне стандартызацыі, метралогіі, ацэнкі адпаведнасці і акрэдытацыі.**

«Мы гэтыя дакументы адпрацоўвалі непасрэдна перад выездам у Аман, і апошнія ўзгадненні вяліся яшчэ ўчора ўвечары. Тое, што мы да апошняга адпрацоўвалі ўсе фармулёўкі, сведчыць аб тым, што ёсць зацікаўленасць абодвух бакоў, — адзначыў у гутарцы з журналістамі **міністр замежных спраў Беларусі Максім РЫЖАНКОЎ.** — Гэта першыя крокі, якія сёння выбудоўваюць архітэктуру нашага супрацоўніцтва ў названых галінах. А ў далейшым павінны быць дапоўнены ўжо канкрэтнымі праектамі па рэалізацыі тых задум, пра якія мы дамовіліся ў ходзе гэтага візіту».


Фота БелТА.

Акрамя таго, у час візіту Прэзідэнта за рамкамі сустрэч на вышэйшым узроўні адбылося вельмі шмат кансультацый і перагавораў на ўзроўні міністраў — кіраўнікоў МЗС, Мінпрама і Мінсельгасхарча.

> **«Разам са сваімі партнёрамі мы адпрацоўвалі канкрэтныя механізмы выбудоўвання супрацоўніцтва. А калі мы гаворым пра міністраў сельскай гаспадаркі, харчавання і прамысловасці, то адпрацаваны былі ўжо канкрэтныя рэальныя праекты. Узгоднены карты па рэалізацыі гэтых праектаў. Гэта датычыцца і расфасоўкі нашага дзіцячага сухога харчавання ў Амане, і далейшага продажу на мясцовым рынку і за мяжой. Датычыцца паставак сухога малака, некаторых круп. Ёсць цікавасць да ветэрынарных прэпаратаў», — расказаў Максім Рыжанкоў.**

Таксама вялася размова аб магчымасці пастаўкі мясной прадукцыі, паколькі ў беларускіх вытворцаў ёсць сертыфікаты халяль, і гэта дазваляе заходзіць на рынак Амана.

«Інакш кажучы, гэта ўжо не проста размовы, а канкрэтныя дамоўленасці, па якіх таксама падпісаны асобныя дарожныя карты. У іх вызначаны крокі, як мы будзем рэалізоўваць гэтыя праекты», — падкрэсліў кіраўнік МЗС.

Ён адзначыў, што ў адпаведнасці з гэтымі картамі ўжо ў найбліжэйшы час адбудуцца ўзаемныя візіты на ўзроўні дзелавых колаў, і прадстаўнікі кампаній на сваім узроўні зоймуцца наладжваннем доўгатэрміновых і трывалых адносін.

Акрамя таго, бакі ўзгаднілі тэкст сумеснай заявы ад імя кіраўнікоў дзяржаў. У дакуменце абазначаны ўсе ключавыя кірункі супрацоўніцтва. «Гэта сумеснае камюніке адлюстроўвае сутнасць многіх дамоўленасцяў, якія былі заключаны ў ходзе цяперашняга візіту», — адзначыў міністр.

У цэлым ён ацэньвае вынікі візіту як вельмі пазітыўныя і накіраваныя ў будучыню.

> **«Пытанне цяпер у рэалізацыі. Як заўсёды гаворыць наш Прэзідэнт, мала дамовіцца, мала пагадзіцца, падпісаць нешта. Мяне вельмі радуе, што за падпісаннем пагадненняў ужо ідуць канкрэтныя дамоўленасці аб візітах нашых кампаній у Аман і аманскіх — у Беларусь. Яны зацікавіліся нашай сістэмай аховы здароўя, лекамі, ветэрынарнымі прэпаратамі, малочкай, прадуктамі харчавання. Вельмі добра папрацавала тут дэлегацыя па лініі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання», — падкрэсліў кіраўнік МЗС.**

Максім Рыжанкоў адзначыў, што Аман важны для Беларусі з пункту гледжання стварэння хаба для пастаўкі прадукцыі не толькі на мясцовы рынак, але і ў іншыя краіны рэгіёна, улічваючы вельмі шырокае кола кантактаў і тысячагадовы вопыт работы аманцаў на рынках Афрыкі, Індыі і іншых краін.

«Таму мы разлічваем на іх садзейнічанне. А іх садзейнічанне будзе, таму што яны таксама бачаць у гэтым сваю цікавасць. Яны пагледзелі на гаму прадукцыі, што намі выпускаецца, убачылі рэчы, якія могуць быць успрыняты не толькі тут, але і недзе ва Усходняй Афрыцы, на тых прадпрыемствах, у якія яны сёння ўклалі інвестыцыі за межамі краіны», — расказаў міністр.

### ДЛЯ ЎСТАНАЎЛЕННЯ ДОЎГАТЭРМІНОВЫХ ВЫГАДНЫХ КАНТРАКТАЎ

Мемарандум аб узаемаразуменні паміж Міністэрствам прамысловасці Беларусі і Міністэрствам гандлю, прамысловасці і садзейнічання інвестыцыям Амана ў галіне прамысловага супрацоўніцтва падпісалі кіраўнікі ведамстваў дзвюх краін Аляксандр ЯФІМАЎ і Кайса аль-Юсэф у прысутнасці міністра замежных спраў Максіма Рыжанкова і пасла Беларусі ў Амане Сяргея Цярэнцьева.

> **«Падпісанне мемарандума азначае сабой важны крок і адкрывае вялікія перспектывы па развіцці эфектыўнага ўзаемадзеяння Беларусі і Амана. Рэалізацыя дакумента дасць магчымасць кансалідаваць намаганні для ўстанаўлення доўгатэрміновых узаемавыгадных кантактаў. Упэўнены, што супрацоўніцтва дзвюх краін у сферы прамысловасці будзе садзейнічаць эканамічнаму росту дзяржаў», — пракаментаваў міністр прамысловасці.**

Галоўная мэта падпісанага мемарандума — стварыць аснову для ўмацавання і развіцця двухбаковага супрацоўніцтва ў сферы прамысловай кааперацыі. Згодна з тэкстам падпісанага мемарандума, бакі дамовіліся садзейнічаць сумесным інвестыцыям у прамысловыя праекты, пастаўкам прамысловых тавараў, умацаванню супрацоўніцтва ў галіне навуковых даследаванняў, развіццю новых галін прамысловасці, патлумачылі ў Мінпраме.

Дакументам таксама прадугледжваецца ўзаемадзеянне па пытаннях арганізацыі сумесных прадпрыемстваў і зборачных вытворчасцяў.

Палажэнні мемарандума ўключаюць супрацоўніцтва ў сферы арганізацыі візітаў, наведвання спецыялізаваных міжнародных канферэнцый і семінараў, правядзення сустрэч і кансультацый паміж экспертамі па канкрэтных пытаннях, якія маюць агульны інтарэс.


Фота БелТА.

**Меркаванне**

## Выбар Мінска на карысць прагрэсіўнай сусветнай большасці — стратэгічны вектар



«Выбар Мінска на карысць прагрэсіўнай сусветнай большасці, да якой належыць Аман, з'яўляецца стратэгічным вектарам. Мы падобным чынам успрымаем глабальныя і рэгіянальныя працэсы і пазіцыянуем сябе на міжнароднай арэне», — адзначыў **аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў (БІСД) Віталь РАМАНОЎСКІ** ў YouTube-праекце БелТА «Па факце: рашэнні Першага».

Эксперт акцэнтаваў, што стратэгічная мэта Беларусі і Амана — развіццё лагістычных калідораў на нашым кантыненце ў мэтах паглыблення трансрэгіянальнай транспартнай звязанасці і далейшага пашырэння шматбаковых эканамічных партнёрстваў.

«Мінск і Маскат надаюць важнае значэнне спалучэнню лагістычнага патэнцыялу дзяржавы і яе вытворчых магутнасцяў у мэтах максімальна эфектыўнага выкарыстання ўласнай інфраструктуры для прасоўвання рознай прадукцыі на замежныя рынкі. Напрыклад, Аман традыцыйна мае вельмі цесныя сувязі з рэгіёнам Усходняй Афрыкі. У сваю чаргу Беларусь, паглыбляючы кантакты з краінамі Афрыканскага кантынента, зацікаўлена ў вывучэнні патэнцыялу аманскіх асаблівых эканамічных зон», — звярнуў увагу аналітык БІСД.

Паводле яго слоў, прыхільнасць Мінска і Маската да выкаранення голаду і стабілізацыі глабальных рынкаў прадуктаў харчавання адкрывае магчымасці па кааперацыі ў сферы харчовай бяспекі, у тым ліку ў сферы вытворчасці і экспарту сельскагаспадарчай прадукцыі і перапрацоўцы прадуктаў харчавання.

«Шматабяцальным кірункам з'яўляецца ўзаемадзеянне паміж рэгіёнамі Беларусі і Амана, якое можа забяспечыць неабходную хуткасць рэагавання на новыя ўмовы і своечасовае выяўленне схаваных рэзерваў і пунктаў росту ў беларуска-аманскіх адносінах», — дадаў Віталь Раманоўскі.

# У ФОКУСЕ ЎВАГІ — РЭГІЁНЫ

**У Копысі Аршанскага раёна прайшло выязное пасяджэнне экспертна-кансультатыўнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, на якім былі абмеркаваны пытанні ўстойлівага развіцця рэгіёнаў на аснове стварэння імпартазамяшчальных і каапераційных вытворчасцяў і актыўнага выкарыстання механізмаў іх фінансавай падтрымкі.**



Фота БелТА.

«Гарадскі пасёлак Копысь быў выбраны месцам правядзення пасяджэння невыпадкова, перш за ўсё зыходзячы з работы са зваротамі грамадзян. Яшчэ ў 2017 годзе Прэзідэнт паставіў задачу на прыкладзе такіх населеных пунктаў, як Копысь, на працягу пяці гадоў у кожнай вобласці стварыць па два такія ж добраўпарадкаваныя з наяўнасцю ўсёй неабходнай інфраструктуры населеныя пункты. І гэта задача была выканана. Цяпер у фокусе нашай увагі — абмеркаванне тэмы: як жывуць такія населеныя пункты і што можна зрабіць яшчэ, каб людзі жылі, працавалі, вучыліся, заставаліся ў рэгіёнах і развівалі нашу краіну», — адкрыла пасяджэнне **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.**

**Міністр эканомікі Юрый ЧАБАТАР** распавёў, што за апошнія чатыры гады ў краіне было створана каля 80 значных вытворчасцяў, з кожным годам расце і выраўноўваецца сярэдняя зарплата па рэгіёнах. Наряўне з гэтым існуюць і праблемныя моманты, якія заключаюцца ў канцэнтрацыі працоўнага патэнцыялу ў сталіцы, у сувязі з чым з пачатку года на 29 тысяч павялічылася колькасць свабодных вакансій. «Ініцыятыва «Адзін раён — адзін праект» прыносіць рэгіёнам адчувальны вынік. Сёння іх колькасць вырасла да 208 праектаў, прычым амаль з палове ўсіх раёнаў рэалізоўваецца па два праекты, а ў асобных — больш як чатыры. За два гады толькі за кошт гэтых праектаў рост інвестыцый склаў тры мільярды рублёў, а колькасць створаных працоўных месцаў павінна перавысіць дзесяць тысяч», — адзначыў міністр.

Юрый Адамавіч дадаў, што з наступнага года праграма «Адзін раён — адзін праект» трансфармуецца: будзе ўкаранёна новая рэгіянальная ініцыятыва. Яе мэта — аказанне падтрымкі інвестарам без уключэння праектаў у якія-небудзь пералікі. Плануецца аказваць фінансавую падтрымку суб'ектам малога і сярэдняга прадпрымальніцтва пры рэалізацыі праектаў у рэгіёнах (за выключэннем сталіцы, абласных цэнтраў і прылеглых да іх раёнаў). Для гэтага пашыраны кірункі і палепшаны ўмовы крэдытавання. У прыватнасці, для аграрных раёнаў стаўка знiжана да 6,5 працэнта.

**Старшыня праўлення ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь» Сяргей СТАЛЯРЧУК** расказаў аб фінансавай падтрымцы з боку банка рэалізацыі інвестыцыйных праектаў, накіраваных на рэгіянальнае развіццё. Так, у бягучым годзе прафінансаваны праекты ў 102 раёнах, пры гэтым найбольшая актыўнасць назіраецца ў Аршанскім раёне.

З пачатку бягучай пяцігодкі на тэрыторыі вобласці рэалізавана больш за 160 інвестыцыйных праектаў, інвеставана 2,4 мільярда рублёў, трэцяя частка якіх — у малыя населеныя пункты. З 2021 года створана 353 новыя прадпрыемствы ў сферы вытворчасці, дзе арганізавана больш за дзве тысячы працоўных месцаў.

«З пачатку рэалізацыі ініцыятывы «Адзін раён — адзін праект» у вобласці ўжо рэалізавана восем праектаў, створана 176 новых працоўных месцаў. Дадаткова прыцягнута ў бюджэт пяць мільёнаў рублёў. Да канца бягучай пяцігодкі мы плануем завяршыць яшчэ 22 праекты. Уцягнута ў гаспадарчы абарот нявыкарыстоўвальная маёмасць аблспажыўтаварыства пад стварэнне швейнай вытворчасці ў Докшыцах, вытворчасць сыроў у Гарадоцкім раёне. Усяго з 2021 года пад рэалізацыю інвестыцыйных праектаў прададзена 18 нявыкарыстоўвальных аб'ектаў, з іх 13 перададзены бязвыплатна. У мэтах павышэння лакалізацыі вытворчасцяў і павелічэння глыбіні перапрацоўкі мясцовай сыравіны ў бягучай пяцігодцы мы рэалізуем 50 імпартазамяшчальных праектаў з аб'ёмам інвестыцый 500 мільёнаў рублёў», — адзначыла **намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Анжаліка НІКІЦІНА**, дадаўшы, што нараўне з рэалізацыяй паспяховых праектаў існуюць праблемы з прыцягненнем інвестараў праз недастатковыя магутнасці электрычных падстанцый. Дзяржаўная дапамога патрэбна і праектам у сферы турызму.

«Абсалютна згодна з вамі, Віцебскую вобласць трэба развіваць. Калі не хапае магутнасці падстанцый, трэба іх абавязкова пабудаваць. І турыстычны патэнцыял рэгіёна, канешне, вельмі недаацэнены», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Падводзячы вынікі пасяджэння экспертна-кансультатыўнага савета, Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што мы абсалютна на правільным шляху. «Вынікі ўжо ёсць. Яны дазваляюць нам бачыць, што рэгіёны нашы развіваюцца, і досыць ныдрэнна. Уся справа цяпер за людзьмі. Мне вельмі спадабалася сёння выступленне міністра эканомікі, ён абсалютна правільна сказаў: да рэалізацыі ініцыятыў на месцах трэба больш прыцягваць выхадцаў, якія тут калісьці жылі і маюць магчымасць стварыць нейкі бізнес на сваёй малой радзіме. «Вярніся на малую радзіму» — гэта выдатна! Гэта тое, што сёння патрэбна нашай краіне», — заключыла спікер.

У гэты дзень удзельнікі сустрэчы таксама азнаёміліся з паспяховымі прадпрыемствамі ў Копысі. ТАА «МІЛККАП СТАРТ» з сакавіка бягучага года выпускае сырную прадукцыю, работнікі прадпрыемства — жыхары гарпасёлка і найбліжэйшых населеных пунктаў. Яшчэ адзін удалы прыклад — дрэваапрацоўчы ўчастак № 2 (Копысь) Аршанская лясгаса, нядаўна тут адкрылі сушыльны комплекс з кацельняй.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

*г. п. Копысь, Аршанскі р-н.*

Каштоўнасці

# «Захоўваючы гістарычную памяць, будзем упэўнена глядзець у будучыню»

## У Нацыянальным гістарычным музеі адкрылася выстаўка «Беларусь адзіная і непераможная»

**Экспазіцыя, створаная пры садзейнічанні Палаты прадстаўнікоў, раскрывае вялікае значэнне для сучаснай Беларусі дзвюх найважнейшых гістарычных падзей: уз'яднання беларускага народа ў верасні 1939 года і Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Выстаўка заснавана на ўнікальных фотаздымках калекцыянера, лаўрэата прэміі Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра Ліхадзедава. На іх адлюстраваны віды нашых гарадоў і вёсак да ўз'яднання і нямецка-фашысцкай акупацыі, падчас ваеннага перыяду. На кантрасце — сучасны выгляд населеных пунктаў, адноўленых у мірны час, у тым ліку ў гады незалежнасці. Узмацняюць уўленне аб гэтых гістарычных перыядах дакументы, тагачасныя перыядычныя выданні і рукапісныя матэрыялы.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

### «Эфектыўная зброя ў інфармацыйнай вайне»

Як звярнуў увагу **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА,** адкрыццё выстаўкі «Беларусь адзіная і непераможная» — рэалізацыя чарговага этапу праекта «Бацькаўшчына», які на працягу 20 гадоў ажыццяўляецца Уладзімірам Ліхадзедавым. Спікер адзначыў вялікую работу ў падрыхтоўцы экспазіцыі і супрацоўнікаў Нацыянальнага гістарычнага музея. «Што, здавалася б, агульнага паміж 1939-м і 1945-м? Ёсць такое ўстойлівае выказванне: без упартых баёў, у тым ліку на тэрыторыі Беларусі, 1941 года не было б і Перамогі 1945-га. Можна дапоўніць наступным выказваннем: без уз'яднання Беларусі ў 1939 годзе наступленне фашыстаў было б больш імклівым», — заўважыў спікер.

Ігар Сергяенка заўважыў, што ўнікальнасць выстаўкі ў тым, што на канкрэтных фотаматэрыялах, у простай, даходлівай форме паказваюцца гістарычныя падзеі. Ён выказаў упэўненасць, што экспазіцыя нікога не пакіне абыякавым: яна, па яго словах, будзе не толькі абуджаць цікавасць да вывучэння гісторыі, але і садзейнічаць развіццю даследчай дзейнасці, фарміраванню пачуцця гонару за нашу краіну. «Нам трэба папулярызаваць сваю гісторыю: абараняючы гістарычную праўду і захоўваючы гістарычную памяць, будзем развіваць сваю краіну і ўпэўнена глядзець у будучыню», — падкрэсліў Старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Па словах **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў доктара гістарычных навук Вячаслава ДАНІЛОВІЧА,** праект «Бацькаўшчына» акурат з'яўляецца яскравым прыкладам, як неабходна захоўваць гістарычную памяць. «Выстаўка нясе ў сабе не толькі сэнс захавання гісторыі, гэта яшчэ і эфектыўная зброя ў інфармацыйнай вайне, у супрацьдзеянні скажэнню і фальсіфікацыі нашага гістарычнага мінулага, — удакладніў дэпутат. — Гэта выстаўка — у тым ліку і вынік дзяржаўнай гістарычнай палітыкі Рэспублікі Беларусь, якая праводзіцца дзякуючы прынцыповай пазіцыі і падтрымцы нашага нацыянальнага лідара».

### «Выстаўка паказвае подзвіг беларускага народа»

**Дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Аляксандр ХРАМЫ** адзначыў, што вынікам шматгадовай працы музейных супрацоўнікаў, якія ездзілі па населеных пунктах Беларусі і шукалі адлюстраваныя на фотаздымках аб'екты, стала не толькі выстаўка, але і дзве кнігі — «Беларусь адзіная» і «Беларусь непераможная». Па яго словах, праект быў рэалізаваны ў рамках гранта Прэзідэнта.

Дырэктар музея паведаміў, што ў межах праекта быў даследаваны не толькі вялікі фотаархіў Нацыянальнага гістарычнага музея. Яго супрацоўнікамі вывучаны ўсе перыядычныя выданні, якія выходзілі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, а таксама тыя, што друкаваліся ў Савецкім Саюзе аб Заходняй Беларусі. Многае экспануецца ўпершыню. У найбліжэйшы час выстаўку ўбачаць і ў рэгіёнах.

Як звярнуў увагу **першы намеснік міністра культуры Дзмітрый ШЛЯХЦІН,** нягледзячы на шматлікія драматычныя падзеі ў лёсе беларускага народа, нашы людзі кожны раз аднаўлялі краіну з руін. «Нашы продкі паказвалі, як яны любяць сваю Радзіму, як яны гатовы, нягледзячы ні на што, прыкладаць усе намаганні для таго, каб іх зямля была квітнеючай, — канкрэтызаваў ён. — У першую чаргу мы павінны аддаць даніну павагі ўсім тым, хто прымаў удзел у аднаўленні нашай краіны пасля Вялікай Айчыннай вайны. Гэта выстаўка ў чарговы раз нам паказвае подзвіг беларускага народа не толькі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, але і ў пасляваенны час».

Па словах **старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандра КАРЛЮКЕВІЧА,** Уладзімір Ліхадзедаў, фотаздымкі з калекцыі якога складаюць аснову выстаўкі, зрабіў вялікую справу. «Толькі ў Беларусі старая паштоўка стала выразным складнікам не проста гістарычнага выхавання грамадства, — падкрэсліў ён. — Яна стала складнікам палітычнага, ідэалагічнага выхавання беларускага народа».

Экспазіцыя зацікавіць розныя катэгорыі наведвальнікаў. У прыватнасці, маладыя людзі абавязкова ацэняць інтэрактыўную віктарыну «Бацькаўшчына», прысвечаную гістарычнаму мінуламу беларускага народа.

**Вераніка КАНЮТА.**

Ва ўрадзе

# СТРАТЭГІЯ РАЗВІЦЦЯ

## Як рэалізаваць патэнцыял турыстычнай галіны?



Фота БелТА.

**Патэнцыял турыстычнай галіны Беларусі неабходна рэалізаваць на поўную сілу. Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА падчас пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў, паведаміла БелТА.**

— Сфера турызму — адна з найважнейшых галін эканомікі, якую мы пакуль не задзейнічаем на поўную сілу. Для многіх дзяржаў гэта калі не лідзіруючая, то адна з асноўных сфер, якія прыцягваюць валютныя сродкі ў краіну. І тут няма прамой залежнасці ад таго, якая гэта краіна: курортная, аграрная, марская ці без выхаду да мора. Пытанне толькі ў тым, наколькі эфектыўна раскрываецца патэнцыял турыстычнай сферы ў кожнай дзяржаве. Беларусь валодае сваімі ўнікальнымі магчымасцямі і дастаткова высокімі кампетэнцыямі ў сферы, напрыклад, аздараўленчага турызму. Наша краіна вельмі прывабная для замежных гасцей. Мы вядомыя сваёй ветлівасцю, адкрытасцю, гасціннасцю, дастаткова высокім узроўнем паслуг, што аказваюцца за разумную плату. Але пакуль гэтая сфера не дае чаканай аддачы для ВУП краіны. Дынаміка ёсць, аднак яна зусім не ўражвае. І, самае галоўнае, пакуль не адчуваецца сістэмных падыходаў да павышэння ролі гэтай сферы ў эканоміцы краіны, — сказаў Раман Галоўчанка.

Кіраўнік урада адзначыў, што турыстычная індустрыя мела сур'ёзныя цяжкасці пасля абмежаванняў, звязаных з пандэміяй. «Але ківаць на той перыяд ужо бессэнсоўна. Галіна павінна была аднавіцца, і яна аднавілася. Усім прыйшлося перастройвацца пад новыя ўмовы. Па выніках года экспарт турыстычных паслуг чакаецца на ўзроўні 270 мільёнаў долараў, што перавышае дапандэмійны перыяд. Пры гэтым пераважную частку экспарту турпаслуг мы атрымліваем за кошт турыстаў з Расійскай Федэрацыі. Гэта добра, але недастаткова. Заўважных рашэнняў або выніку ад дыверсіфікацыі экспарту турпаслуг не адбылося», — адзначыў прэм'ер-міністр.

Кіраўнік урада звярнуў увагу на тое, што значна вырас унутраны турызм:

— Гэта адна з задач, якую мы перад сабой ставілі. З 2019 года колькасць турыстаў, якія падарожнічаюць унутры краіны, вырасла на 60 працэнтаў. Нагадаю, што 2019 год па многіх паказчыках быў найлепшым для турыстычнай сферы Беларусі. Разам з тым трэба прызнаць, што гэты вынік абумоўлены не толькі эфектыўнай работай кіраўніцкага звяна, але і знешнімі фактарамі, якія ўскладняюць лагістыку і робяць даражэйшым кошт выязнога турызму, — канстатаваў прэм'ер-міністр.

«Не садзейнічае далейшаму паступальнаму развіццю турызму ў краіне і недастаткова развітая інфраструктура для знаходжання гасцей. На жаль, для размяшчэння арганізаваных турысцкіх груп недастаткова гасцініц эканом-класа, якія здольныя адначасова прыняць і абслужыць гасцей. Найбольш характэрна такая праблема якраз для турыстычных рэгіёнаў. Таму ў нас унутраны турызм арыентаваны пераважна на аднадзённыя або двухдзённыя паездкі. Ёсць неабходнасць развіваць прыдарожны сэрвіс, прыдарожны сэрвіс, асабліва на найбольш запатрабаваных маршрутах. Усе мы разумеем, што турысты становяцца больш патрабавальнымі. Сэрвіс у некаторых гасцініцах, асабліва ў раённых цэнтрах, не самага высокага ўзроўню і выклікае справядлівыя нараканні», — акрэсліў праблемныя пытанні Раман Галоўчанка.

«Добра, што нам удалося пераламаць унутраную меркаванне аб тым, што ў краіне няма чаго глядзець і што трэба абавязкова кудысьці ехаць для таго, каб убачыць прывабныя мясціны. У Беларусі ёсць што паглядзець, ёсць дзе правесці час, ёсць дзе пакінуць грошы, але не хапае даступнай і цікавай інфармацыі аб гэтым. Практычна няма комплексных прапаноў, арыентаваных на асобныя мэтавыя аўдыторыі, найперш на моладзь. Работа ў гэтай сферы павінна быць, як і ў любой іншай, агрэсіўнай і наступальнай у добрым сэнсе», — акцэнтаваў увагу прэм'ер-міністр. Ён даручыў далажыць аб выніках рэалізацыі нацыянальнай стратэгіі развіцця турызму за апошнія тры гады і ў цэлым аб прынятых дзяржаўнымі структурамі мерах па ўдасканаленні работы галіны.

**У тэму**

### НАСУПЕРАК САНКЦЫЯМ

2024 год будзе рэкордным па экспарце турыстычных паслуг. Аб гэтым заявіў **міністр спорту і турызму Беларусі Сяргей КАВАЛЬЧУК.**

«Нягледзячы на санкцыі, значная колькасць замежных грамадзян прыбывае да нас. Думаю, што гэта ўсё дзякуючы рашэнню кіраўніка дзяржавы па бязвізе. Санаторна-курортны бізнес — гэта 49 працэнтаў экспарту турыстычных паслуг, гасцінічны — 30 працэнтаў», — адзначыў Сяргей Кавальчук.

Найбольшы паток турыстаў прыбывае з Расіі. Развіваецца і ўзаемадзеянне з Кітаем: «Калі раней адзін самалёт раз на тыдзень лётаў з Пекіна, то цяпер пачалися яшчэ палёты ва Урумчы. З 28 снежня будзе яшчэ адзін рэйс (у Сіянь. — **Рэд.**)».

«Турызм — вельмі важная для краіны галіна. Мы разглядаем, якія праблемы ў гэтай сферы хвалююць нашых грамадзян і якія меры трэба прыняць, каб узняць экспарт турыстычных паслуг на яшчэ больш высокі ўзровень. Шукаем пункты росту, за кошт якіх у эканоміку будзе паступаць яшчэ больш сродкаў ад развіцця турызму. Вызначаем, што трэба зрабіць у сферах транспартнага забеспячэння, прыдарожнага сэрвісу, гасцінічнага бізнесу, каб якасць паслуг была яшчэ лепшай», — сказаў Сяргей Кавальчук.

У прыватнасці, не хапае гасцінічных нумароў. «Ёсць населеныя пункты з выдатным турыстычным патэнцыялам (напрыклад, Гродна), але гасцінічных нумароў не хапае. У сталіцы іх таксама недастаткова пры правядзенні буйных мерапрыемстваў. Тое ж можна сказаць і пра Брэст, Віцебшчыну. Нам неабходна сканцэнтравацца на будаўніцтве і ўдасканаленні існуючага гасцінічнага фонду. Трэба развіваць і прыдарожны сэрвіс», — падкрэсліў міністр.

Паводле яго слоў, па ўсіх напрамках створаны рабочыя групы, якія праводзяць інвентарызацыю. «Усе гэтыя пытанні мы закладзём у праграму на наступную пяцігодку», — дадаў Сяргей Кавальчук.

Задача ад Першага

*Павінен быць нармальны музей, куды асабліва малады чалавек зойдзе і выйдзе, пераканаўшыся ў тым, што мы маем права на сваю дзяржаўнасць, мы яе дабіліся, заслужылі цяжкай працай, потам і крывёй, пражыўшы нават не стагоддзе, а тысячагоддзе.*

*Аляксандр Лукашэнка*
*падчас нарады*
*па пытаннях архітэктурнага рашэння*
*і канцэпцыі экспазіцыі*
*культурна-гістарычнага комплексу*
*«Нацыянальны гістарычны музей».*
*6 верасня 2024 года.*

## «Гэта агульнанацыянальная справа»

**Дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Аляксандр ХРАМЫ:**

— Як толькі Прэзідэнтам было дадзена даручэнне, мы пачалі актыўна працаваць над яго выкананнем. Ужо створаны навуковая канцэпцыя будучай экспазіцыі, яе сцэнарны план. Для таго каб гэта быў сучасны музей, як у тэатры, мы павінны разумець, якія эмоцыі ў якой частцы экспазіцыі мы хочам выклікаць у наведвальніка. Ад гэтага залежыць, якія прадметы мы падбяром і якія сучасныя сродкі, інфармацыйныя тэхналогіі ў тым ліку, прыменім для таго, каб ажыццявіць нашу задуму. Цяпер актыўна працуем над стварэннем тэматыкі экспазіцыйнага плана: над падборам прадметнага раду, інфармацыйных сродкаў. Паралельна ўзаемадзейнічаем з мінскім мастацкім камбінатам, які дапаможа зрабіць першасную візуалізацыю будучага музея, каб мы маглі яе прадставіць нашай навукова-гістарычнай супольнасці для абмеркавання, крытыкі, дапаўненняў. Мы разумеем, што гэта агульнанацыянальная справа, а не толькі справа Нацыянальнага гістарычнага музея. Таму далучаем да гэтай работы шырокае кола людзей, у першую чаргу навукоўцаў. Каб шырока і аб'ектыўна паказаць усю гісторыю беларускай дзяржаўнасці, трэба сумленна падыходзіць да задач, агучаных кіраўніком дзяржавы. Мы разумеем, што ёсць давер да нашай дзейнасці і вялікая адказнасць за якасць у рэалізацыі праекта, таму падыходзім да гэтага з пэўным псіхалагічным трапятаннем. Ведаем, як гэта рабіць і, самае галоўнае, навошта.

Прыемна, што, нават знаходзячыся ў замежнай камандзіроўцы, наведваючы Нацыянальны музей Амана, Прэзідэнт цікавіўся музейнай індустрыяй, заклапочаны будучыняй нашага музея. Для нас гэта вялікая падтрымка, бо ўсе мы хочам у выніку атрымаць якасны і сумленны прадукт. Дарэчы, пяць гадоў таму Нацыянальны гістарычны музей заключыў дагавор аб супрацоўніцтве з Нацыянальным музеем Амана. У гэтай краіне мы рэалізавалі два нашы праекты, заснаваныя на калекцыі нашага музея. Першая выстава, якую мы адкрывалі ў Амане, называлася «Беларусь на перакрыжаванні цывілізацый». Мы вазілі ў Аман дастаткова вялікую колькасць нашых прадметаў, якія паказвалі сувязі Беларусі з Усходам: нумізматыку, жаночыя ўпрыгажэнні і іншае. Калі мясцовыя жыхары бачылі Аль-Кітаб, напісаны арабскімі літарамі, але на беларускай мове, якую яшчэ можна было пачуць, гэта дастаткова цікава. Калі бачылі свае арабскія манеты (дзірхамы) IX стагоддзя, гэта выклікала ў іх захапленне. Другі выставачны праект, які мы вазілі ў Аман, быў звязаны з тэмай этнаграфіі: паказвалі нашы багатыя фальклорныя традыцыі, нацыянальную вопратку, традыцыі саломапляцення. Сувязі паміж нашымі краінамі пашыраюцца. Спадзяюся, што і далей будзем супрацоўнічаць з Нацыянальным музеем Амана.

**Вераніка КАНЮТА.**

26 студзеня 2025 ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# У АДПАВЕДНАСЦІ З ЗАКАНАДАЎСТВАМ І ПАВАЖАЮЧЫ СУВЕРЭНІТЭТ

## Місія наглядальнікаў ад СНД пачала работу на выбарах Прэзідэнта Беларусі

**Генеральны сакратар СНД, кіраўнік місіі наглядальнікаў ад СНД на выбарах Прэзідэнта Беларусі Сяргей ЛЕБЕДЗЕЎ атрымаў пасведчанне міжнароднага наглядальніка нумар адзін. Традыцыйна місія наглядальнікаў ад СНД будзе ажыццяўляць свае функцыі строга ў адпаведнасці з беларускім заканадаўствам, паважаючы суверэнітэт дзяржавы, аб'ектыўна ацэньваючы працэс падрыхтоўкі і правядзення выбарчай кампаніі.**

«Гэта ўжо 13-я місія па назіранні за выбарамі ў Рэспубліцы Беларусь з 2001 года, — адзначыў Сяргей Лебедзеў. — Папярэдні вопыт узаемадзеяння з ЦВК, адпаведнымі структурамі Рэспублікі Беларусь па арганізацыі выбараў пераконвае нас у тым, што ўзаемадзеянне будзе канструктыўным. Я нават бы сказаў сяброўскім, што адпавядае адносінам паміж партнёрамі на прасторы СНД».

Генсек СНД падкрэсліў, што місія прыязджае ў Беларусь у якасці сяброў. «Асаблівасць назірання за выбарамі ў Беларусі заключаецца яшчэ і ў тым, што ў Мінску знаходзіцца штаб-кватэра СНД, — заўважыў ён. — Гэта добрая база для фарміравання місіі, і гэта нам аблегчыць арганізацыю назірання. Штаб уже сфарміраваны і прыступіў да работы, ён размяшчаецца ў Выканаўчым камітэце СНД».

Па словах кіраўніка місіі, у маніторынгу выбараў Прэзідэнта Беларусі будуць удзельнічаць каля 200 наглядальнікаў ад СНД. «Усе краіны Садружнасці пацвердзілі сваю згоду вылучыць кандыдатаў у склад місіі СНД. На жаль, за выключэннем Украіны і Малдовы. Астатнія пацвердзілі», — удакладніў Сяргей Лебедзеў.

Як паведаміў у размове з журналістамі **старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар КАРПЕНКА,** паводле прагнозаў, міжнародных наглядальнікаў на прэзідэнцкіх выбарах будзе ў 1,5-2 разы больш, чым у адзіны дзень галасавання. «Ёсць суб'екты, якія надзелены правам запрашаць міжнародных наглядальнікаў. Гэта Прэзідэнт нашай краіны, Усебеларускі народны сход, абедзве палаты парламента, урад, Міністэрства замежных спраў і Цэнтральная выбарчая камісія, — адзначыў ён. — На сённяшні момант усе запрашэнні накіраваны, чакаем зваротную сувязь. — Наглядальнікі ад СНД традыцыйна актыўныя, яны ўжо атрымалі першыя акрэдытацыйныя пасведчанні. Акрамя таго, мы пачалі атрымліваць зваротную сувязь ад цэнтральных выбарчых органаў не толькі СНД, але і тых краін, з якімі ўзаемадзейнічаем у рамках Сусветнай асацыяцыі выбарчых органаў. Акрамя таго, будуць запрошаны індывідуальныя эксперты, накіраваны ў тым ліку і запрашэнні ў шэраг іншых аўтарытэтных міжнародных арганізацый».

На сённяшні момант ЦВК акрэдытаваны 75 міжнародных наглядальнікаў.

**Паводле БелТА.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «НКФО «Белинкасгрупп», г. Минск, ул. Либаво-Роменская, 23. УНП 807000270 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |

**Предмет электронного аукциона: транспортные средства, бывшие в употреблении. Месторасположение: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 69**

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, руб. |
|---|---|---|
| **1** | PEUGEOT EXPERT PRACTIK PR1610, AP 8134-7, 2010 г. в. | **16 941,58** |
| **2** | PEUGEOT EXPERT PRACTIK PR1610, AP 8175-7, 2011 г. в. | **17 004,59** |
| **3** | PEUGEOT EXPERT PRACTIK PR1610, AP 9561-7, 2011 г. в. | **17 068,21** |
| **4** | PEUGEOT EXPERT PRACTIK PR1610, AP 8128-7, 2011 г. в. | **16 942,99** |
| **5** | PEUGEOT EXPERT PRACTIK PR1610, AP 8105-7, 2011 г. в. | **17 000,76** |
| **6** | VOLKSWAGEN TRANSPORTER RUCAR, AI 3973-7, 2009 г. в. | **19 030,46** |
| **7** | PEUGEOT EXPERT PRACTIK PR1610, AP 9573-7, 2011 г. в. | **16 975,75** |
| **8** | VOLKSWAGEN TRANSPORTER, AP 8202-7, 2008 г. в. | **14 219,92** |
| **9** | VOLKSWAGEN TRANSPORTER, г/н AP 8203-7, 2008 г. в. | **12 860,47** |

**Цена снижена на 20 %**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN); БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней** после торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, которое является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы». Страница лота содержит информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов, либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 23.11.2024 г.

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до момента определения победителя торгов, без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 30.12.2024 г. с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 27.12.2024 г. до 17.00**
на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор аукциона) по поручению **Унитарного предприятия «Санаторий «Приморский» Общественного объединения «Белорусское общество глухих»** (продавец) проводит открытый аукцион по продаже:

- **НАСОСНОЙ СТАНЦИИ 2-ГО ПОДЪЕМА с инв. № 600/С-139472 общей площадью 117,6 кв. м, адрес: Минская область, Минский район, Папернянский с/с, 24, район аг. Семково, ОЦ «Озерный»,**
- **АРТСКВАЖИНЫ С ПАВИЛЬОНОМ СТАНЦИИ ПЕРВОГО ПОДЪЕМА ВОДЫ № 1 ПОДЪЕМА с инв. № 600/С-172908 общей площадью 8 кв. м, адрес: Минская область, Минский район, Папернянский с/с, район аг. Семково (далее – Объекты).**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623685500001000885 (право постоянного пользования), площадь земельного участка 0,7512 га, адрес земельного участка: Минская область, Минский район, Папернянский с/с, район аг. Семково.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 225 000,00 бел. руб.**

Задаток 10 % от начальной цены – **22 500,00 бел. руб.**

Стоимость снижена на 10 %.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 *(десяти)* рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объектов производится в течение 30 *(тридцати)* банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 01.10.2024.

Аукцион состоится **21.01.2025 г.** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.01.2025 г.** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: (8029) 374-94-69, (8017) 512-34-53.**

УНП 600397856


Сацыялогія

# ВЫСОКІ ЎЗРОВЕНЬ

## Наколькі беларусы давяраюць У БКМА агучылі вынікі

**Беларускі камітэт маладзёжных арганізацый правёў апытанне, каб даведацца, у якой ступені беларусы ва ўзросце ад 18 гадоў давяраюць розным органам улады нашай краіны. Аб гэтым расказаў старшыня Беларускага камітэта маладзёжных арганізацый Павел АЛЕКСА:**

— У лістападзе 2024 года БКМА правёў анлайн-апытанне, у якім прыняло ўдзел больш за 25,6 тысячы беларусаў ва ўзросце, старэйшым за 18 гадоў. У рамках апытання рэспандэнтам прапаноўвалася адказаць на пытанні электроннай анкеты, якая распаўсюджвалася з дапамогай QR-кодаў, анлайн-спасылак у сацыяльных сетках і чатах, размяшчэння кантэксных запрашэнняў на інтэрнэт-сайтах. Сярод апытаных — у асноўным моладзь, работнікі прадпрыемстваў, прадстаўнікі бізнес-супольнасці і іншыя.

**У ЯКОЙ СТУПЕНІ ВЫ ДАВЯРАЕЦЕ СЁННЯ**




* *Пазіцыя даследуецца ўпершыню.*

Паводле даных БКМА, у лістападзе ў анлайн-апытанні ўзялі ўдзел 25,6 тысячы беларусаў ва ўзросце 18 гадоў і старэйшыя. Інфаграфіка БЕЛТА

Павел Алекса нагадаў, што ў гэтым годзе абнавілі дэпутацкі корпус краіны і ўпершыню ў статусе канстытуцыйнага органа выбралі Усебеларускі народны сход. Яго першым Старшынёй стаў кіраўнік нашай дзяржавы. Цяпер прадугледжаны Канстытуцыяй цыкл пераўтварэнняў завяршаюць выбары Прэзідэнта.

— У сувязі з гэтым мы вывучылі ўзровень даверу грамадзян да асноўных інстытутаў улады ва ўмовах мадэрнізацыі палітычнай сістэмы Беларусі ў адпаведнасці з абноўленай Канстытуцыяй. Рэспандэнтам прапанавалі выказаць думку аб іх стаўленні да УНС, старшыні УНС, кіраўніка дзяржавы, урада, парламента і мясцовых органаў улады, — адзначыў старшыня БКМА.

Згодна з апытаннем, вышэйшаму органу народаўладдзя давяраюць 68,2 працэнта апытаных. Гэта сведчыць аб тым, што з першых дзён сваёй работы ў новым канстытуцыйным статусе УНС папулярны ўжо і набірае аўтарытэт у грамадстве.

Узровень даверу да старшыні УНС, кіраўніка дзяржавы займае лідзіруючыя пазіцыі — 86,6 працэнта. Пры гэтым, як паказваюць адказы на адкрытыя пытанні, высокі ўзровень даверу звязаны з вялікай адказнасцю і шырокім колам стратэгічных задач, якія вырашае Прэзідэнт.

— Парламенту давяраюць 70,5 працэнта рэспандэнтаў. Пры гэтым крыху больш за чвэрць не змаглі адказаць на дадзенае пытанне. Гэта сведчыць аб тым, што апытаныя адносна нядаўна выбралі сваіх прадстаўнікоў у парламент і пакуль аб выніках іх работы гаварыць рана. Ураду давяраюць 72,8 працэнта апытаных. Мясцовым органам улады давяраюць 68,7 працэнта рэспандэнтаў. Дарэчы, менавіта яны бліжэй за ўсё да грамадзян. А таму ўзровень патрабаванняў і крытычнага ўспрымання іх насельніцтвам значна вышэйшы, чым іншых органаў улады, — лічыць Павел Алекса.

### «Будучыня за новымі лічбавымі рашэннямі»: эксперт — аб анлайн-апытаннях

Анлайн-апытанням можна давяраць, калі іх праводзяць прафесіяналы. Такое меркаванне выказаў **аспірант кафедры паліталогіі БДУ Уладзіслаў КАЗЛОЎСКІ.**

— Сацыялогія пераходзіць у лічбавае асяроддзе. Па-першае, гэта хутчэй і зручней, калі апытанне

Будучыня краіны вачыма беларусаў:
**ІНТАРЭС ДА ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАГА ПАРАДКУ ДНЯ**




У апытанні Цэнтра сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ ўзялі ўдзел 1,5 тысячы беларусаў у розных рэгіёнах краіны, лістапад 2024. Інфаграфіка БЕЛТА

Дарэчы

# ТРЭНД — БЫЦЬ У КУРСЕ ПАДЗЕЙ

**Большасць беларусаў сочаць за грамадска-палітычным парадкам дня, упэўнена загадчык кафедры эканамічнай сацыялогіі і псіхалогіі прадпрымальніцкай дзейнасці, кіраўнік Цэнтра сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ Ірына ЛАШУК.**

Паводле апытання, 66,8 працэнта рэспандэнтаў пастаянна сочаць за грамадска-палітычным парадкам дня і стараюцца быць у курсе падзей. 23,4 працэнта — перыядычна, 9,8 працэнта не цікавяцца наогул.

— Сёння беларусы ў большасці не апалітычныя, яны стараюцца самі сачыць за палітычным парадкам дня, фарміраваць уласнае меркаванне. Гэта сведчыць пра ўжо свядомую палітычную пазіцыю беларусаў, — патлумачыла Ірына Лашук.

Беларусам таксама прапаноўвалася назваць ключавыя каштоўнасці. Мір назвалі 67,7 працэнта апытаных, бяспеку — 66,4 працэнта, самабытнасць і патрыятызм — 65,3 працэнта.

Спецыяліст растлумачыла, што ўдзельнікі апытання выбіралі з прапанаваных варыянтаў прыдатныя для сябе. На аснове ўсіх адказаў спецыялістамі быў праведзены аналіз інфармацыі.

— Калі мы гаворым — мір, то гэта не проста адсутнасць вайны. Гэта ў тым ліку мірная стваральная праца, адсутнасць розных канфліктаў: міжасобасных, сацыяльных, міждзяржаўных. Бяспека — гэта не толькі тое, што беларусам не страшна выходзіць на вуліцу ўвечары (гэта трэнд Беларусі), але і бяспека дзяржавы, — адзначыла загадчык кафедры. — Самабытнасць і патрыятызм — гэта ў тым ліку захаванне беларускай ідэнтычнасці і патрыятычнае самабытнае суіснаванне з іншымі народамі, якія дружалюбна да нас ставяцца. Гэта такі патрыятызм штодзённасці — для таго, каб быць патрыётам, трэба кожны дзень нешта рабіць для сваёй краіны.

Надзеі на будучыню 56,5 працэнта беларусаў звязваюць з рашэннямі органаў дзяржаўнай улады, 55,8 працэнта спадзяюцца на саміх сябе, 48,7 працэнта звязваюць са сваякамі і сябрамі, 28,3 працэнта — з прадпрыемствам, арганізацыяй, 6,2 працэнта — з замежнымі краінамі, міжнароднымі арганізацыямі.

— Рэферэнтнае асяроддзе — сям'я, сябры — заўсёды было традыцыйна на першых месцах. Таксама насельніцтва стала больш давяраць уладзе. Людзі даволі часта звяртаюцца па дапамогу да чыноўнікаў, напрыклад, на прыёмах грамадзян, і ніхто з тых, хто звярнуўся, не застаецца сам-насам са сваімі праблемамі. І другая пазітыўная тэндэнцыя — людзі спадзяюцца на саміх сябе. Гэта значыць, яны разумеюць, што трэба і самім рабіць пэўныя крокі — рэалізоўвацца ў прафесіі, забяспечваць сям'ю, вырашаць кватэрнае пытанне. Такая мэтанакіраванасць, несумненна, здольна павышаць якасць жыцця. Сёння высокая адказнасць нашых людзей, хочацца свядомай прадказальнай будучыні, і надзея менавіта на ўласныя сілы, дзяржорганы, а не на замежныя краіны і нейкага незразумелага характару міжнародныя арганізацыі, — дадала Ірына Лашук.

У апытанні Цэнтра сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ ўзялі ўдзел 1,5 тысячы беларусаў у розных рэгіёнах краіны. Апытанне праведзена ў лістападзе 2024 года.

# ДАВЕРУ органам улады? анлайн-апытання

размяшчаецца на спецыялізаванай электроннай платформе. QR-код з яе адрасам распаўсюджваецца праз месенджары, электронную рассылку, сацыяльныя і карпаратыўныя сеткі, таргетаваную рэкламу, — расказаў Уладзіслаў Казлоўскі. — Гэта эканоміць рэсурсы, не патрабуецца вялікая сетка інтэрв'юераў. Плюс такая форма дае магчымасць атрымліваць не толькі колькасныя даныя, але і якасныя, паколькі інтэрнэт-карыстальнік больш свабодны ў магчымасцях выказваць сваю пазіцыю. Гэта забяспечвае вялікі масіў якасных даных.

Будучыня краіны вачыма беларусаў:
**НАДЗЕІ НА БУДУЧЫНЮ ЗВЯЗАНЫ**




У апытанні Цэнтра сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ ўзялі ўдзел 1,5 тысячы беларусаў у розных рэгіёнах краіны, лістапад 2024.
Інфаграфіка БЕЛТА

На яго думку, вынікам праведзенага анлайн-апытання можна абсалютна давяраць з прычыны наступных пазіцый:

— Апытанне праводзіцца арганізацыяй, якая мае афіцыйную акрэдытацыю ў Рэспубліцы Беларусь (у нашым выпадку БКМА); пытанні складзены прафесійнымі сацыёлагамі; апрацоўка вынікаў ажыццяўляецца з абавязковым выкарыстаннем навуковых методык; праграмнае забеспячэнне анлайн-платформы дае магчымасць разлічыць выбарку, максімальна набліжаную да рэпрэзентатыўнай, што забяспечвае высокую ступень валіднасці атрыманых вынікаў.

Даныя анлайн-апытання прасцей апрацоўваць, адзначыў эксперт:

— Паколькі няма неабходнасці збіраць папяровыя або разрозненыя электронныя формы апытанняў, спецыяльная праграма аўтаматычна ў рэжыме рэальнага часу апрацоўвае інфармацыю, якая паступае. На выхадзе мы ўжо атрымліваем чыстыя даныя з графікамі, тэндэнцыямі і да т. п.

Ён дадаў:

— Анлайн-апытанне дае магчымасць літаральна ў лічаныя гадзіны ахапіць усю краіну і атрымаць дзясяткі тысяч адказаў. Як паказваюць статыстыка Белстата і справаздачы Мінсувязі, у нас з кожным годам расце ўзровень уключанасці насельніцтва ўсіх узроставых груп у выкарыстанне інтэрнэту і розных сродкаў камунікацыі. Мы нават на бытавым узроўні бачым, як нашы бабулі і дзядулі карыстаюцца сацыяльнымі сеткамі, месенджарамі. За гэтым будучыня.

**Па матэрыялах БелТА.**

Будучыня краіны вачыма беларусаў:
**КЛЮЧАВЫЯ КАШТОЎНАСЦІ**




У апытанні Цэнтра сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ ўзялі ўдзел 1,5 тысячы беларусаў у розных рэгіёнах краіны, лістапад 2024.
Інфаграфіка БЕЛТА

# Пад крыламі бусла

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Мінскі міжнародны выставачны цэнтр — аб'ект унікальнай інфраструктуры, які адпавядае самым сучасным міжнародным патрабаванням у галіне кангрэсна-выставачнай дзейнасці, — падкрэсліла **намеснік дырэктара па выставачнай дзейнасці Дзяржаўнага прадпрыемства «БелЭкспа» Вікторыя АГАФОНАВА.** — Унікальны ён з пункту гледжання магчымасцяў трансфармацыі, падключэння камунікацый, вышыні столяў, забеспячэння тэхналагічных і тэхнічных рашэнняў. З яго з'яўленнем, мы ўпэўнены, у нашу краіну прыйдуць сур'ёзныя, ключавыя, маштабныя выставачныя і кангрэсныя мерапрыемствы.

Плошча новага аб'екта — 37 тысяч кв. м, і гэта ў разы больш, чым звыклы мінчанам выставачны комплекс на праспекце Пераможцаў, нават калі дадаць да яго экспазіцыйныя плошчы знесенага ў 2017 годзе павільёна на вуліцы Янкі Купалы.

— Закрытая выставачная плошча ММВЦ складае 15 тысяч кв. м, адкрытая — 22 тысячы кв. м, — сказала Вікторыя Агафонава.

Паводле ідэі праекціроўшчыкаў, у дзень комплекс зможа прыняць каля 15 тысяч гасцей.

— Неабходнасць будаўніцтва такога выставачнага цэнтра наспела даўно, — адзначыла намеснік дырэктара «БелЭкспа». — У нашай краіне адсутнічала пляцоўка, якая магла б забяспечыць тэхнічныя патрабаванні для правядзення буйных кангрэсна-дзелавых мерапрыемстваў: форумаў, канферэнцый, з'ездаў. Цяпер Беларусь зможа гучаць на міжнароднай арэне не толькі як чыстая, адкрытая, спакойная краіна, але і як ключавы пункт дзелавых падзей.

## Рашэнні інавацыйныя, матэрыялы айчынныя

Выставачны комплекс новы ва ўсіх адносінах: інавацыйны і высокатэхналагічны. Найбуйнейшае збудаванне раёна «Паўночны бераг» стане адным з ключавых аб'ектаў разумнага горада. Будынак выглядае эфектна — нагадвае крылы бусла, раскінутыя ў палёце.

— У аснову архітэктурнага рашэння пакладзена ідэя аб тым, што бусел — гэта нацыянальны сімвал Беларусі, — заўважыла Вікторыя Агафонава. — І пад яго крыламі змогуць збірацца людзі, каб праводзіць мерапрыемствы рознай накіраванасці: культурныя, дзелавыя, атмасферныя, падзейныя.

У ММВЦ будуць працаваць тры канферэнц-залы (найбуйнейшая з іх разлічана на больш чым 600 чалавек), рэстаран, памяшканні для бізнес-перагавораў. Дах над цэнтральнай часткай комплексу — шкляны, а вышыня столяў — 14 метраў. Экспазіцыйныя плошчы пад адкрытым небам прадугледжваюць дэманстрацыйную зону, разлічаную на самыя цяжкія машыны.

Унікальны для нашай краіны аб'ект — сінтэз сусветнага вопыту будаўніцтва такіх гігантаў, беларускіх матэрыялаў і прафесіяналізму айчынных будаўнікоў, а таксама беларускіх і некаторых замежных найноўшых будаўнічых тэхналогій.

— Пры тым што многія будаўнічыя рашэнні былі інавацыйныя для нашай краіны, большасць матэрыялаў — беларускай вытворчасці, і будаваўся аб'ект беларускімі спецыялістамі, — падкрэсліла Вікторыя Агафонава.

Эксплуатацыйнай арганізацыяй ММВЦ будзе рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Нацыянальны выставачны цэнтр «БелЭкспа» Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Новы комплекс стане падарункам на 56-годдзе адзінага ў Беларусі дзяржаўнага апаратара, які развівае нацыянальную выставачную дзейнасць — адну з ключавых галін у вырашэнні многіх найважнейшых задач сучаснасці.

## Месца сілы

Аб'ект пабудаваны ў рэкордныя тэрміны — яго ўзвядзенне распачата ў лістападзе 2022 года, а цяпер практычна ўсе работы завершаны.

Першым мерапрыемствам, якое пачне гісторыю новага комплексу, стане выстава дасягненняў суверэннай Беларусі «Мая Беларусь» (яна ўжо манціруецца на экспазіцыйных плошчах ММВЦ). «Мая Беларусь» — падзея, што дазваляе ўбачыць будучыню нашай краіны праз яе сучаснасць, адзначыла Вікторыя Агафонава. На плошчы больш за 30 тысяч кв. м. (у павільёне і пад адкрытым небам) выстава раскажа, чаго дасягнула краіна за гады незалежнасці. Тут жа будуць размешчаны фудкорт і зона адпачынку, фотазоны і інсталяцыі «Мая Беларусь — месца сілы». Сярод наведвальнікаў выставы «Мая Беларусь» чакаецца вялікая колькасць замежных дэлегацый.

Экспазіцыя будзе прадстаўлена ў фармаце тэматычных лакацый: «Знак якасці», «Культурная спадчына», «Мы будучыня», «Разумны горад», «Навука і інтэлект», «Клопат і здароўе», «Атамная энергія», «Сельская гаспадарка» і г. д. У цэлым, выстава падзелена на 11 тэматычных кластараў, праанансавала мерапрыемства спікер. Кожны прадпрыемству дасягненні ў вызначанай ключавой галіне эканомікі.

Унікальнасць выставы — у падачы матэрыялу, распавялі арганізатары: будзе шмат інтэрактыву, а таксама экспанатаў, якія раней ніхто не бачыў у адкрытым доступе. Наведвальнікі змогуць «здзейсніць віртуальныя падарожжы» ў асобныя куткі краіны, акунуцца ў традыцыі, адкрыць для сябе шмат новага аб розных рэгіёнах.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания
• Взыскание задолженности
• Проведение торгов
• Ликвидация
• Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29 |

**Вторые повторные публичные торги (аукцион). Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 04.12.2024 г. в газете «Звязда» № 236 (30370), стр. 6**

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| № | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, в бел. руб. | Минимальная цена с учетом НДС 20 %, в бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Пассажирский теплоход «Заря-03», год выпуска – 1975 | 48 620,00 | 29 172,00 |
| 2 | Автомобиль МАЗ 5516, 2008 года выпуска | 22 483,07 | 13 489,84 |

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях.
Перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа **– ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг аукциона** – 5 % от начальной цены лота

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by

**Срок подписания договора купли-продажи – 10 (десять) рабочих дней** после публичных торгов (аукциона)

**Условия оплаты предмета торгов (аукциона) – 10 (десять) рабочих дней** со дня заключения договора купли-продажи. Переход права собственности – после полной оплаты имущества

**Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресам: https://iintorgi.by**

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившиеся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от 1 % в зависимости от конечной цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее, чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 09.01.2025.
Заявки на участие в публичных электронных торгах (аукционе) принимаются по 08.01.2025 г. до 17.00.
Начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов.
Торги проводятся на электронной торговой площадке https://iintorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

**Лот № 1: капитальное строение с инвентарным номером 161/С-20596** (наименование: **жилой дом;** назначение: **здание одноквартирного жилого дома),** площадью 46,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Каменецкий р-н, Волчинский с/с, д. Волчин, ул. Ленина, 52, на земельном участке с кадастровым номером 124081701601000285, площадью 0,2049 га, составные части и принадлежности: терраса, сарай с погребом, гараж, два сарая, навес, уборная

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб.** | **25 570,77** | **Размер задатка, руб.** | **2 557,08** |

**Продавец:** ОАО «Беловежский», Брестская обл., Каменецкий р-н, аг. Беловежский, ул. Ленина, 2, тел. 80163172881. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. Условия продажи: без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенного договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее, чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. **Шаг аукциона:** 5 % от предыдущей названной цены

**Аукцион состоится 30 декабря 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 30 декабря 2024 г. до 10.00**

***Уважаемые акционеры ОАО «Элегант»***

**30 декабря 2024 года в 16.00**
**по решению Наблюдательного Совета Общества состоится внеочередное общее собрание акционеров.**

**Повестка дня:**
1. Об избрании нового состава членов наблюдательного совета.

Форма проведения собрания – очная.

С материалами, подготовленными к собранию, и списком акционеров, составленным на основании реестра владельцев ценных бумаг эмитента по состоянию на 20.12.2024 г., имеющих право участвовать в собрании, можно ознакомиться по адресу: г. Жодино, пр-т Ленина, 22, 2 этаж, бухгалтерия с 20.12.2024 г. с 9.30 до 16.45 и в день проведения собрания до 15.00 по адресу: г. Жодино, пр-т Ленина, 22, бухгалтерия. Справки по телефону: (01775) 6-80-74.

Начало регистрации 30.12.2024 г. с 15.00 по 15.45 по адресу: г. Жодино, пр-т Ленина, 22 ОАО «Элегант», бухгалтерия.

Для участия в собрании при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт; представителю акционера – паспорт и доверенность, заверенную в установленном порядке.

УНН 600039318

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390. www.cpo.by |
| **Продавец** | ОАО «НКФО «Белинкасгрупп», 220028, г. Минск, ул. Либаво-Роменская, 23. УНП 807000270 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191 224 638. www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронного аукциона: транспортные средства, бывшие в употреблении. Месторасположение: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 69**

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, руб. |
|---|---|---|
| 1. | FORD TRANSIT CONNECT «INDEEC» 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 9564-7 | 15 000,00 |
| 2. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 9575-7 | 15 000,00 |
| 3. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 8108-7 | 15 000,00 |
| 4. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 8110-7 | 15 000,00 |
| 5. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294595, 2011 г. в., рег. знак АР 8122-7 | 15 000,00 |
| 6. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-02, 2011 г. в., рег. знак АР 8123-7 | 21 720,00 |
| 7. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 29459, 2011 г. в., рег. знак АР 8131-7 | 18 960,00 |
| 8. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591, 2011 г. в., рег. знак АР 8121-7 | 12 240,00 |
| 9. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 8109-7 | 15 000,00 |
| 10. | FORD TRANSIT CONNECT VAN INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 8118-7 | 18 960,00 |
| 11. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 9601-7 | 18 960,00 |
| 12. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 8094-7 | 18 960,00 |
| 13. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 8098-7 | 18 960,00 |
| 14. | FORD TRANSIT INDEEC 29459101, 2011 г. в., рег. знак АР 8143-7 | 15 000,00 |
| 15. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 29459, 2011 г. в., рег. знак АР 8126-7 | 15 000,00 |
| 16. | FORD TRANSIT CONNECT «INDEEC» 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 9563-7 | 12 240,00 |
| 17. | FORD TRANSIT CONNECT INDEEC 29459, 2011 г. в., рег. знак АР 8142-7 | 21 720,00 |
| 18. | FORD CONNECT INDEEC 294591-01, 2011 г. в., рег. знак АР 9560-7 | 15 000,00 |
| 19. | VOLKSWAGEN CADDY PYCAR 294544-03, 2010 г. в., рег. знак АР 8201-7 | 12 960,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN); БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившиеся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by).
Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, которое является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы».
Страница лота содержит информацию о типе торгов и общих правилах их проведения.
Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившиеся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от цены продажи лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до момента определения победителя торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Рэспубліка» от 23.11.2024 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 30.12.2024 г. с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 27.12.2024 г. до 17.00**
на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**



**ОАО «Пинский винодельческий завод»**
**сообщает о проведении 31.12.2024 г. вторых повторных электронных торгов в форме открытого аукциона по продаже:**

**1) ПРЕДПРИЯТИЯ КАК ИМУЩЕСТВЕННЫЙ КОМПЛЕКС:**

**Брестская область, Пинский р-н, пос. Садовый, ул. Советская, 2 – 9 382 796,00 без НДС.**

**Подробную информацию можно узнать на сайте bankrot.gov.by.**

УНН 200110728



В газете «Звязда» № 242 (30376) от 12.12.2024 г. (стр. 10, 11) ООО «Фрондера» было размещено извещение о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Профитсистем», назначенного на 26.12.2024 г. в 11.30. В извещении были неверно указаны номера лотов, по этой причине были внесены изменения: по лоту № 1297 – Видеопроектор NEC NP100G (70215) изменился № лота на 1298, по лоту № 1443 – Уст-ка вент пылеулав. УПВ-3000С (Россия)-1 (50426509) изменился № лота на 1243.

Подробнее о торгах по телефону +375293042560.

УНП 192789344


# «ЖЫВЁМ ПРАДЧУВАННЕМ НАВАСЕЛЛЯ»





*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Таццяна і Максім Арэхавы — равеснікі, знаёмыя амаль з дзяцінства, дакладней, з падлеткавага ўзросту. Менавіта тады сям'я Максіма пераехала з Бабруйска ў Брэст. Даволі доўга яны камунікавалі проста як сябры, была агульная кампанія, агульныя інтарэсы. Потым узнікла каханне, стварылі сям'ю. Абаім на той час было па 22 гады. І калі ўжо сталі мужам і жонкай, аднойчы прызналіся адно аднаму, што ўзаемная цікавасць нарадзілася адразу, з тых самых школьных гадоў, калі ўпершыню сустрэліся. Значыць, лёс.

## ПРАРОЧАЕ САЧЫНЕННЕ

— Насамрэч мне вельмі пашанцавала з мужам, — гаворыць Таццяна, калі мы застаёмся ўдзвюх на яе ўтульнай кухні. — Ён і ёсць тая самая мая палавінка, мая надзейная апора. Ён заўсёды падтрымае добрым словам, і справай таксама, дзяцей дагледзіць, сняданак згатуе, калі толькі дома.

Праўда, работа такая, што вельмі часта бацька сямейства бывае ў камандзіроўках, як індывідуальны прадпрымальнік займаецца дастаўкай машын з-за мяжы. Яно і не дзіва: трэба круціцца, каб такую сям'ю забяспечваць: расце шасцёра дзяцей.

Старэйшая дачушка Тавіфа вучыцца ў пятым класе, Вірсавія ходзіць у чацвёрты, Філіп — другакласнік, Матфею чатыры гады. А Равіль і Рахіль — двайняткі, 19 снежня ім спаўняецца год. Такім чынам, бацькі маюць трох дачок і трох сыноў. Ёсць у іх і сямейная гісторыя, якая прэтэндуе стаць некалі сямейнай легендай. Калі Вірсавія была ў другім класе, аднойчы на ўроку настаўніца дала заданне напісаць, аб чым дзеці мараць, што хочуць, каб прынёс ім наступны год. Большасць пісалі, вядома, пра розныя падарункі ды пачастункі, а Вірсавія напісала: «Хачу, каб у нашай сям'і нарадзіліся двайняты». Настаўніца тады паказала маме гэтае «сачыненне». Дарослыя толькі паўсміхаліся, ды і забыліся. Яшчэ ж было, як той казаў, ні сном ні духам. А вось калі Таццяне Вячаславаўне падчас ультрагукавога даследавання сказалі пра двойню, тады і згадала сваю малую «прарочыцу». Цяпер яна часам жартуе: «Напрарочыла дваіх — цяпер дапамагай мне!»

— Насамрэч дзеці заняты вучобай, музыкай, у іх вольнага часу мала, — расказвае маці сямейства, — але ж растуць не гультаямі, дапамагаць стараюцца.

Захапленне музыкай у дзяцей ад яе: у свой час скончыла музычную школу. І ўжо трое займаюцца музыкай, Тавіфа іграе на скрыпцы, Вірсавія вучыцца па класе фартэпіяна, а Піліп асвойвае віяланчэль. Інструмент вялікі, мама два разы на тыдзень возіць яго на заняткі. А за дзве гадзіны, пакуль сынок на ўроку, паспявае заехаць у краму, аптэку, банк, іншыя ўстановы, як яна кажа, павырашаць свае мамскія справы, а зрэдку нават удаецца пасядзець у кафэ ды выпіць кубак кавы ў цішыні.

## МАМІНА ПРАЦОЎНАЯ ЗМЕНА

Аўтар гэтых радкоў не ўпусціла магчымасці пацікавіцца, як пры такіх клопатах яна не выглядае змучанай, стомленай, а, наадварот, вясёлай, нават выпраменьвае пазітыў. Таццяна назвала некалькі складнікаў. Па-першае, яна, як, дарэчы, і яе муж, вырасла ў вялікай сям'і. У яе бацькоў, напрыклад, шасцёра дзяцей. Перад вачыма — прыклад бацькоў, якія спраўляліся, значыць, і яна павінна. На яе думку, важна правільна арганізаваць работу дома, трэба адразу выдзяляць, што важна, а што не вельмі, каб за ўсё не хапацца адразу. А яшчэ неабходна выдзяляць час для сябе, для любімых заняткаў. У Таццяны гэта позні вечар, калі ўсе дзеці ўжо спяць. Тады яна сядае і гадзіну-дзве займаецца рукадзеллем, апошнім часам падсела на алмазную мазаіку. Адпачываеш душой і целам, нягледзячы нават на тое, што малыя часта даймаюць бяссоннымі начамі. «Зразумее хіба той, хто сам гадаваў двайнят, — смяецца Таццяна. — Адзін прачнуўся, разбудзіў другога, і панеслася. Асабліва неспакойны Равіль: любімая справа — паплакаць ноччу, а дачушка, наадварот, спакойная. Наогул, яны такія непадобныя, нават вочы розныя... Але ж нічога, бяссонныя ночы — не назаўсёды».

## НА КАРЦЕ ПАДАРОЖЖАЎ — 19 КРАІН

Важны той факт, што пры нараджэнні двойні дзяржава выдзяляе няньку. Яна прыходзіць у будні і дапамагае прыкладна з 12 да 18 гадзін. А мама можа зрабіць свае справы, у тым ліку адвезці малодшага на музыку. Ёсць памочнікі і сярод блізкіх. Нездарма ж гадавалася ў вялікай сям'і. У Брэсце жывуць брат і дзве сястры Таццяны.

Ну і, вядома, муж, калі дома, ва ўсім стараецца падтрымаць. «Я сава, зусім не магу рана ўставаць, — расказвае Таццяна, — а калі Максім дома, ён і сняданак згатуе, старэйшых у школу выправіць, малых падніме, памые, памперсы памяняе. А двайняткі наогул у таты на руках спакайнейшыя, чым у мяне. Бывала, як хачу забраць, дык яны адварочваюцца, маўляў, пасяджу яшчэ ў таты на ручках».

І яшчэ, якая мама шасці дзяцей зможа пахваліцца тым, што перыядычна выбіраецца на экскурсіі ў замежжа!? А Таццяна гаворыць, што пабывала ўжо ў 19 краінах. Калі муж чарговы раз збіраецца ў паездку і гэта не надта доўгая камандзіроўка, часам кліча яе. Яна прызвычаілася пакідаць дзяцей на сваю сястру і дазваляе сабе тыднёвы адпачынак-падарожжа. Кажа так: «Некаторыя не разумеюць, як можна пакінуць такіх малых дзяцей. А я адказваю: лепей дзецям пабыць некаторы час са спакойнай, добразычлівай цёткай, чым са знерваванай, стомленай мамай. Дарога, уражанні, перамена месца, ды і проста адпачынак здольны даць зарад бадзёрасці на новыя мацярынскія подзвігі».

## З ПАДТРЫМКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

Цяпер усе клопаты шматдзетных бацькоў звязаны з будаўніцтвам новага дома. Ім пашанцавала, што ёсць магчымасць жыць у кватэры дваюраднага брата, які працуе за мяжой. Сям'і ўжо некалькі разоў прапаноўвалі кватэру, але Арэхавы адмаўляліся, бо даўно жылі марай пра ўласны дом. І вось два гады таму яны атрымалі бясплатна ўчастак у вёсцы Вістычы, гэта сем кіламетраў за рысай горада, і пачалі будоўлю. «Участак вельмі добры, крайні па вуліцы, далей толькі поле і лес», — гавораць сужэнцы.

Дом будзе вялікі, уладкаваны цалкам па іх гусце. Дзяржаўную субсідыю, якая выдзяляецца шматдзетным сем'ям, Арэхавы ўжо цалкам выкарысталі. Цяпер у доме вядуцца работы па ўнутраным аздабленні, наперадзе — добраўпарадкаванне ўчастка. «Дом — наша мара, а для вялікай сям'і — проста надзённая патрэба. Дзеці займаюцца музыкай, увечары ледзь загучаў інструмент — суседзі ўжо ў сцяну стукаюць. Некага паклічаш у госці з дзецьмі — абавязкова будзе шумна. А тут малым можна свабодна бегаць, гуляць, іграць на любым музычным інструменце. Ды і свежае паветра для здароўя — раскоша», — падсумаваў бацька сямейства.

Па спецыяльнасці Таццяна Арэхава — кравец верхняга адзення. Да першага дэкрэтнага паспела папрацаваць тры гады. «Цяпер пакуль што працую мамай, калі і меншыя пойдуць у школу, падумаю аб тым, каб выйсці на работу», — сказала Таццяна.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота аўтара і з архіва герояў.**



Конкурс

# ПЕРАЕМНІКІ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЙ УЛАСНАСЦІ

## У Мінску адбыўся заключны этап конкурсу «Адкрываючы свет інтэлектуальнай уласнасці. 2024»

**Рашэнне праводзіць гэты конкурс было прынята ў 2022 годзе. Ініцыятарамі выступілі Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці, Міністэрства адукацыі, Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях і Еўразійскае патэнтнае ведамства Еўразійскай патэнтнай арганізацыі.**

Узрост удзельнікаў — ад 13 да 18 гадоў. І гэта адна з асноўных адметнасцяў мерапрыемства. Бо менавіта на гэтым этапе сталення, калі дзіця перастае быць дзіцем, але яшчэ не становіцца дарослым, яно фарміруецца як асоба, як грамадзянін. Пачынае ўсведамляць, якую багатую спадчыну пакінулі нам бацькі і дзяды, якая прадукцыя спрадвеку выраблялася на нашай зямлі і дайшла да нашага часу. Ганарацца гэтым і ставіць перад сабой задачу не толькі прадаўжаць справу продкаў, але і напаўняць яе новым, сучасным сэнсам. Да гэтай мэты падводзяць арганізатары конкурсу яго юных удзельнікаў, прыцягваючы ўвагу да пытанняў інтэлектуальнай уласнасці, папулярызуючы і распаўсюджваючы веды ў гэтай сферы. Вядома, у рамках конкурсу быў прадугледжаны і практычны складнік — для тых, хто сваю будучыню звязвае з вынаходніцтвам і інжынерна-тэхнічнай творчасцю.

Конкурс выйшаў за рамкі рэспубліканскага. Сёння ў ім прымае ўдзел моладзь з Беларусі, Расіі, Казахстана і Таджыкістана — гэта навучэнцы школ, каледжаў і ўніверсітэтаў — усяго болей за 900 чалавек. У спаборніцтве чатыры этапы, тры з якіх удзельнікі ўжо прайшлі. Яны праслухалі лекцыйныя матэрыялы, кожны самастойна выканаў заданні. У заключным, і, мабыць, самым цікавым, этапе канкурсанты падрыхтавалі індывідуальныя праекты па тэме, якую вызначыў для кожнага арганізацыйны камітэт.

Па выніках нацыянальных залікаў пераможцамі конкурсаў сталі: вучань Фарынаўскай сярэдняй школы Арцём Быкаў (Беларусь), навучэнка ліцэя з Казахстана Руфіна Бакірава, Ажмаджон Назараў, студэнт Таджыкскага нацыянальнага ўніверсітэта, і Глеб Мялешка, студэнт Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Уладальнікам Гран-пры стаў наш юны суайчыннік Арцём Быкаў.

Работа пераможцы звязана з гісторыяй роднага горада Полацка: школьнік распрацаваў праект аксесуара для посуду — чахла, дзе адлюстраваны знакавыя месцы і аб'екты Полацка. «Фішка» заключаецца ў тым, што сярод іх няма шырока вядомых, звязаных са старажытнай гісторыяй.

— Многія здзіўляюцца, чаму на конкурс я прадставіў менавіта гэты праект, — распавядае ўладальнік Гран-пры. — Па сваім складзе я гуманітарый, да таго ж у мяне вельмі добры настаўнік гісторыі, які не толькі вучыць прадмету, — ён вучыць любіць сваю малую радзіму з усім тым, што яна нам падарыла, гісторыяй у тым ліку. Мы, моладзь, павінны пісаць летапіс ужо сучаснай гісторыі старажытнага Полацка. Вось за гэта я і ўзяўся.

Наогул на конкурс было прадстаўлена шмат цікавых і, што важна, з перспектывай з часам ажыццявіцца ў практыцы, праектаў: шакалад на палачцы, упакоўка для малака ў выглядзе збана...

— Гэты конкурс ужо трэці, — адзначае **генеральны дырэктар Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці Уладзімір РАБАВОЛАЎ,** — у гэтым годзе ён значна пашырыўся геаграфічна, выйшаўшы за межы Рэспублікі Беларусь. Думаю, што і надалей ён будзе толькі набіраць абароты. У нас многа таленавітай моладзі. Якія распрацоўкі ўласнага прамысловага ўзору прадставілі сёння, па сутнасці, яшчэ дзеці! Ад этыкеткі да бампера аўтамабіля і суперсучаснага тэлевізара. І арганізавала ўсё гэтае мерапрыемства таксама моладзь — нашага Цэнтра. Працавалі, тварылі і начамі, і ў выхадныя. У іх усё атрымалася.

Не засталіся ў цені славы сваіх выхаванцаў і ўстановы адукацыі, і іх настаўнікі. Лідарам у намінацыі «Найлепшая ўстанова адукацыі» стала Фарынаўская сярэдняя школа Полацкага раёна. «Найлепшым настаўнікам» — педагог гэтай жа школы Ірына Шлемен.

**Алена ВІНАГРАДАВА, фота аўтара.**



Уладальнік Гран-пры конкурсу Арцём БЫКАЎ.


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | Смолевичское райпо, Минская обл., г. Смолевичи, ул. Советская, д. 133. УНП 600048660 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638, **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Здание магазина**
(здание нежилое, **1873 кв. м,** 614/С-19321, составные части: подвал).
Адрес: **Минская обл., Смолевичский р-н, Озерицко-Слободской с/с, аг. Слобода, ул. Молодежная, 1Б**

***Сведения о земельном участке:*** общ. пл. **0,1314** га предоставлен на праве аренды (срок действия по 07.01.2068 г.) для обслуживания здания магазина № 40

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 3 690 977,00 бел. руб.**

***Обременения***: площади здания магазина частично сданы в аренду

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **30** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 2 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения торгов

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 21.01.2025 г. с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 20.01.2025 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ЗАО «ГОРИЗОНТ-БЕЛИНВЕСТ-ДЕВЕЛОПЕР», 220029, г. Минск, ул. Красная, д. 7, комн. 4. УНП 191438026 |

| № лота | Предмет электронных торгов | Начальная цена, с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Торговое помещение** (инв. № 500/D-798190607, общ. пл. 77,4 кв. м, сост. части и принад.: подсобное помещение магазина № 12, площадью 22,6 кв. м, административное помещение магазина № 14, площадью 12,5 кв. м, гардероб персонала магазина № 15, площадью 18,8 кв. м). Адрес: **г. Минск, ул. Стадионная, 9-256** | **304 980,00** |
| 2 | **Торговое помещение** (инв. № 500/D-798190608, общ. пл. 67,5 кв. м, сост. части и принад.: гардероб персонала магазина № 16, площадью 18,6 кв. м, подсобное помещение магазина № 17, площадью 19,3 кв. м, административное помещение магазина № 18, площадью 14,3 кв. м, подсобное помещение магазина № 19, площадью 25,4 кв. м). Адрес: **г. Минск, ул. Стадионная, 9-257** | **337 620,00** |
| 3 | **Торговое помещение** (инв. № 500/D-798190610, общ. пл. 59,4 кв. м, сост. части и принад.: административное помещение магазина № 24, площадью 19,8 кв. м, подсобное помещение магазина № 25, площадью 22,1 кв. м, подсобное помещение магазина № 26, площадью 25,5 кв. м). Адрес: **г. Минск, ул. Стадионная, 9-259.** Обременение: договор аренды | **294 780,00** |

**Шаг аукциона** – 5 % от текущей цены.
**Задаток 15 000,00 белорусских рублей** на счет BY92BELB3 012004835008022600 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** со дня завершения электронных торгов

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 17.10.2024 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**: **09.01.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **08.01.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

Героі нашага часу

# «Трэба знайсці і выратаваць людзей»

**Менавіта з такой думкай майстар-ратавальнік пажарнай аварыйна-ратавальнай часці № 1 г. Віцебска прапаршчык Канстанцін Гіркала ішоў у палаючы будынак гандлёвага цэнтра.**



Фота sb.by.

> 13 снежня ў віцебскім гандлёвым цэнтры успыхнуў пажар. Для правядзення ратавальных работ і ліквідацыі пажару былі задзейнічаны 21 адзінка тэхнікі і 90 работнікаў МНС. Плошча пажару склала 2000 квадратных метраў.
>
> Супрацоўнікі МНС пры дапамозе вышыннай тэхнікі выратавалі шэсць чалавек і чацвярых вывелі з памяшканняў пры дапамозе масак, 215 чалавек былі эвакуіраваны.
>
> Прычыны пажару высвятляюцца. Як адзначыў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый КРУТОЙ,** гэты рэзанансны і для Віцебскай вобласці, і для ўсёй краіны выпадак узяты на асабісты кантроль Прэзідэнтам, які даручыў правесці максімальна поўнае расследаванне.

І сваю задачу выканаў — у дзень трагедыі ў ГЦ ён выратаваў жанчыну, якая знаходзілася на чацвёртым паверсе. «Мы ўбачылі жанчыну, і я падняўся па пажарнай лесвіцы, каб дапамагчы ёй выбрацца. Яна клікала на дапамогу і крычала, што ёй цяжка дыхаць. Я пацягнуў яе на сябе, дапамог выбрацца, спусціцца і перадаў медыкам. Пацярпелая сказала, што ў падпаленых памяшканнях могуць заставацца людзі, і я палез на чацвёрты паверх другі раз. На шчасце, нікога ўнутры не знайшоў», — падзяліўся ўспамінамі з журналістамі БелТА Канстанцін.

Падчас пошуку людзей у яго балоне скончыўся кісларод, Канстанцін наглытаўся дыму і ледзь паспеў пакінуць будынак. На вуліцы калегі дапамагалі яму дабрацца да «хуткай», бо сіл у ратавальніка ўжо не засталося і да таго ж ён атрымаў апёкі. Калі адважны пажарны праходзіў курс лячэння, у бальніцы яго наведаў **міністр па надзвычайных сітуацыях Беларусі Вадзім СІНЯЎСКІ** і перадаў герою асабістую падзяку Прэзідэнта.

17 снежня Канстанціна Гіркалу выпісалі. На парозе бальніцы яго сустракалі кіраўнікі пажарнай часці і малодшыя калегі. Яны расказалі карэспандэнтам «СБ. Беларусь сегодня», што прыйшлі далёка не ўсе, хто хацеў бы сустрэць героя. У прыватнасці, **начальнік пажарнай аварыйна-ратавальнай часці № 1 горада Віцебска капітан Раман КРУСЦІНСОН** адзначыў, што Канстанцін — гэта самы добры хлопец часці: «Ён заўсёды пазітыўны. Такое адчуванне, што чалавек не бывае ў дрэнным настроі, у яго заўсёды ўсё добра і ўсё пад кантролем».

**Намеснік начальніка Віцебскага гарадскога аддзела па надзвычайных сітуацыях Дзяніс ГРУНТОЎ** падкрэсліў, што прапаршчык Гіркала — сапраўдны прафесіянал, які ведае ўсе тонкасці ратавальнай работы і заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу маладым калегам, падзяліцца з імі сваім багатым вопытам. А начальнік часці дадаў: «Мы ўсе — пажарнае братэрства, таму ўсе ў добрых адносінах і дапамагаем адзін аднаму. Наша работа першапачаткова спалучана з пэўнай рызыкай, таму часам і здараюцца такія сітуацыі, як гэта адбылося з Канстанцінам Гіркалам. Але каб мінімізаваць рызыкі, мы ўдзяляем вялікую ўвагу навучанню ліквідацыі надзвычайных сітуацый, дарожна-транспартных здарэнняў. І для таго, каб дапамога была сапраўды кваліфікаванай і аказана своечасова, неабходна пастаянна ўдасканальвацца ў сваіх ведах, уменнях, навыках».

Сам жа Канстанцін не лічыць сябе героем, за 10 гадоў службы ён з калегамі не раз літаральна адбіраў людзей у смерці, а выратаваная ў гандлёвым цэнтры жанчына — яго першая індывідуальная перамога. «Ды я не лічу, што сам яе выратаваў, хлопцы паднялі лесвіцу, а падняцца па ёй мог хто заўгодна. Я проста рабіў сваю працу і апынуўся побач, — сціпла сказаў пра свой подзвіг Канстанцін. — Першай і галоўнай думкай было: толькі б ніхто не пацярпеў, трэба знайсці і выратаваць людзей».


**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении повторных
электронных торгов по продаже имущества,
принадлежащего **УП «УНИДРАГМЕТ БГУ»**
на праве хозяйственного ведения **(Продавец).**

**Электронные торги состоятся 13.01.2025 г.**

**Лот № 1:** Чистая комната комплект, инв. № 1046. **Лот № 2:** Кондиционер центральный гигиенический для чистых помещений, инв. № 1040. **Лот № 3:** Установка очистки и обеззараживания воздуха БОВ-001-АМС, инв. № 1041. **Лот № 4:** Шкаф вытяжной лабораторный ШВЛ-1, инв. № 1042. **Лот № 5:** Стол мойка двойная со стеллажом для сушки посуды, инв. № 1043. **Лот № 6:** Рукомойник-тумба. **Лот № 7:** Рукомойник-тумба. **Лот № 8:** Стеллаж для готовой продукции. **Лот № 9:** Стерилизатор ГП40СПУ. **Лот № 10:** Стол для весов. **Лот № 11:** Стол лабораторный 1300*450*900. **Лот № 12:** Стеллаж 1010*510*1850. **Лот № 13:** Стеллаж 1010*510*1850. **Лот № 14:** Стеллаж 1010*410*1850. **Лот № 15:** Стол лабораторный 600*450*900. **Лот № 16:** Стол-мойка низкая широкая. **Лот № 17:** Стол-подставка 800*500*900. **Лот № 18:** Стол-подставка 900*300*800. **Лот № 19:** Шкаф для лабораторной посуды. **Лот № 20:** Шкаф для лабораторной посуды. **Лот № 21:** Шкаф для лабораторной посуды. **Лот № 22:** Шкаф для лабораторной посуды. **Лот № 23:** Шкаф для одежды. **Лот № 24:** Шкаф для одежды. **Лот № 25:** Шкаф лабораторный для химических реактивов. **Лот № 26:** Регулятор скорости. **Лот № 27:** Регулятор скорости. **Лот № 28:** Регулятор скорости. **Лот № 29:** Регулятор скорости. **Лот № 30:** Регулятор скорости. **Лот № 31:**Регулятор скорости. **Лот № 32:** Регулятор скорости. **Лот № 33:** Регулятор скорости. **Лот № 34:** Реле электромагнитное. **Лот № 35:** Реле электро магнитное. **Лот № 36:** Реле электромагнитное. **Лот № 37:** Реле электромагнитное. **Лот № 38:** Реле электромагнитное. **Лот № 39:** Реле электромагнитное. **Лот № 40:** Реле электромагнитное. **Лот № 41:** Реле электромагнитное. **Лот № 42:** Щит монтажный ЩМП. **Лот № 43:** Манометр дифференциальный. **Лот № 44:** Манометр дифференциальный. **Лот № 45:** Манометр дифференциальный. **Лот № 46:** Манометр дифференциальный. **Лот № 47:** Устройство А-417А. **Лот № 48:** Устройство А-417А. **Лот № 49:** Устройство А-417А. **Лот № 50:** Устройство А-417А. **Лот № 51:** Устройство А-605. **Лот № 52:** Устройство А-605. **Лот № 53:** Устройство А-605. **Лот № 54:** Устройство А-605. **Лот № 55:** Устройство ADPS-kit. **Лот № 56:** Устройство ADPS-kit. **Лот № 57:** Устройство ADPS-kit. **Лот № 58:** Устройство ADPS-kit.

**Начальная цена с НДС 20 %** Лота № 1 – 20 280,00 руб., Лота № 2 – 24 120,00 руб., Лота № 3 – 5 520,00 руб., Лота № 4 – 828,00 руб., Лота № 5 – 674,77 руб., Лота № 6 – 66,00 руб., Лота № 7 – 66,00 руб., Лота № 8 – 49,20 руб., Лота № 9 – 438,00 руб., Лота № 10 – 156,00 руб., Лота № 11 – 66,00 руб., Лота № 12 – 55,80 руб., Лота № 13 – 55,80 руб., Лота № 14 – 49,20 руб. Лота № 15 – 51,60 руб., Лота № 16 – 498,00 руб., Лота № 17 – 51,00 руб., Лота № 18 – 37,80 руб., Лотов №№ 19-22 – 300,00 руб. (за один Лот), Лота № 23 – 66,00 руб., Лота № 24 – 66,00 руб., Лота № 25 – 366,00 руб., Лота № 26 – 246,00 руб., Лотов №№ 27-33 – 246,00 руб. (за один Лот), Лотов № 34-41 – 19,80 руб. (за один Лот), Лота № 42 – 58,80 руб., Лотов №№ 43-46 – 102,00 руб. (за один Лот), Лотов №№ 47-50 – 22,80 руб. (за один Лот), Лотов №№ 51-54 – 78,00 руб. (за один Лот), Лотов №№ 55-58 – 6,00 руб. (за один Лот).

**Местонахождения Лотов №№ 1–58:**
**г. Минск, ул. Академика Курчатова, 1а.**

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайте Государственного комитета по имуществу **gki.gov.by,** электронной торговой площадке «GOSTORG» **gostorg.by.**

**Организатор электронных торгов:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• e-mail: torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182



ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие**
**«Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор торгов и оператор электронной
торговой площадки: torgi.rlt.by,
место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)
по поручению **открытого акционерного общества**
**«Смолевичи-Сузон»**
(продавец, место нахождения:
222201, Минская область, г. Смолевичи, ул. Вокзальная, 9а)
проводит открытый аукцион по продаже

**АВТОМОБИЛЯ MAZ 551605,**
**рег. знак АХ 9143-5, VIN Y3M55160590015841,**
**2009 г. в., инв. № по бух. учету 90021,**
**грузоподъемность 20 тонн, находится по адресу:**
**г. Смолевичи, ул. Вокзальная, 9а.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **25 800,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **2 580,00** бел. руб.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) календарных дней с даты проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона)** оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере **5 (пяти)** процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.

Электронные торги состоятся **21.01.2025** в **10.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.01.2025** до **17.00**.

**Тел.: (8017) 516-80-64, (8029) 136 31 11, (8044) 789 10 18.**
**Тел. для осмотра (8029) 170 03 69.**

УНП 691747895



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении
повторных электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Белинвестбанк»** (Продавец)
на праве собственности.

**Электронные торги состоятся 31 декабря 2024 г. в 10.00**

**Лот № 1:**
Изолированное помещение № 549
с инв. № 600/D-64448, площадь 17,0 кв. м.

Начальная цена с НДС 20 % – 7 680,00 белорусских рублей.
Задаток – 768,00 белорусских рублей.

**Адрес:** Республика Беларусь, Минская обл.,
Минский р-н, Щомыслицкий с/с, район аг. Озерцо,
Менковский тракт, 2-549.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Срок для заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов (после предъявления Продавцу копии платежного документа, подтверждающего оплату вознаграждения и затрат на организацию и проведение электронных торгов Организатору электронных торгов).

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 26 декабря 2024 г. в 16.00

**Организатор электронных торгов:**
**☎8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52,**
**torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182



ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА **20 января 2025 г.**
по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность
земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов
**в аг. Кленник, аг. Алесино, д. Кленник Низ, д. Подлипье**
Курганского сельсовета Смолевичского района Минской области.

Организатор аукциона: Курганский сельский исполнительный комитет, 222230, дер. Курганье, ул. Центральная, 8

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | аг. Кленник | 624882505601000193 | 0,1500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | 12 000 |
| 2 | аг. Алесино | 624882500101000360 | 0,1399 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | 12 000 |
| 3 | д. Кленник Низ | 624882506101000056 | 0,2500 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | 11 000 |
| 4 | д. Подлипье | 624882507601000003 | 0,2501 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | 9 000 |

Аукцион состоится **20 января 2025 г. в 15.00** в Курганском сельском исполнительном комитете по адресу: дер. Курганье, ул. Центральная, 8, зал заседаний.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: Государственного комитета по имуществу: **https://au.nca.by,** Смолевичского райисполкома: **http://www.smolevichi.gov.by.**

УНП 600023808

# На карысць пацыентам і медыкам

## У будучым годзе ахова здароўя Гродзеншчыны завершыць аб'яднанне ў адну лакальную сетку

**Работа вядзецца ў рамках дзяржаўнай праграмы «Лічбавае развіццё Беларусі» на 2021—2025 гады. Кожная медыцынская ўстанова вобласці будзе мець лакальную сетку, якую плануецца падключыць да адзінай сістэмы. Гэта дазволіць абменьвацца данымі і запісваць пацыентаў на абследаванні да спецыялістаў, а таксама атрымліваць хуткія вынікі лабараторных даследаванняў. Такі падыход накіраваны на паляпшэнне якасці медыцынскага абслугоўвання і ўдасканальванне работы медыцынскага персаналу.**



### УСЛЕД ЗА НАВАТАРАМ

У Гродзенскай вобласці працягваецца развіццё інфарматызацыі аховы здароўя. У 2025 годзе ў інфармацыйную сістэму будуць уваходзіць усе цэнтральныя бальніцы, раённыя, у тым ліку ФАПы, амбулаторыі ўрача агульнай практыкі. Па словах **начальніка галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Гродзенскага аблвыканкама Людмілы КЕДА**, гэта будзе значным прарывам для медыцыны і для кожнага медработніка. Найперш таму, што можна бачыць усе даныя аб пацыенце.

— Напрыклад, пацыент з Гродзенскай вобласці прайшоў лячэнне ў іншай вобласці альбо ў рэспубліканскіх цэнтрах горада Мінска. Сістэма інфарматызацыі забяспечыць атрыманне ўсіх даных аб пацыенце, бо яны знаходзяцца ў агульнай сістэме. Значная частка нашых медыцынскіх устаноў забяспечана лакальнымі сеткамі, на чарзе — інфарматызацыя фельчарска-акушэрскіх пунктаў, для чаго ідзе закупка абсталявання, камп'ютараў, уладкоўваюцца рабочыя месцы, — паведаміла кіраўнік аховы здароўя вобласці. — Гэты этап пачаты, нядаўна мы праводзілі семінар для галоўных урачоў нашых устаноў, дзе ў прыклад ставілася Астравецкая раённая клінічная бальніца, у якой усе ФАПы ўжо аб'яднаны ў даную сістэму. Цяпер фельчар сельскага ФАПа, дзякуючы атрыманай з бальніцы інфармацыі, бачыць вынікі лабараторных даследаванняў пацыента і мае магчымасць запісаць яго на прыём. Пакуль гэты раён у нас наватар у справе інфарматызацыі. Цяпер перад усімі кіраўнікамі медыцынскіх устаноў стаіць задача ісці па гэтым шляху.

Людміла Кеда падкрэсліла, што разам з тым існуе і пэўная адказнасць медыцынскіх работнікаў за захаванне даных пацыента. Безумоўна, звесткі аб стане здароўя не павінны выходзіць за межы медыцынскіх устаноў.

### ЛЕКІ ПАД КАНТРОЛЕМ

У сістэме інфарматызацыі нямала і іншых плюсаў. Спецыялісты звяртаюць увагу на такі аспект, як статыстыка. Гісторыя кожнага пацыента паступае ў адзіную сістэму і апрацоўваецца спецыяльнай статыстычнай праграмай. Людміла Кеда ўспамінае, што раней усе талоны, якія выдаваліся пацыентам, падлічваліся ўручную. З увядзеннем інфармацыйнай сістэмы гэта робіцца з дапамогай лічбавых тэхналогій.

— Яшчэ адным важным рэсурсам з'яўляецца тое, што ідзе ўлік лекавых сродкаў. Сістэма дазваляе прааналізаваць іх расход, убачыць, якія прэпараты найбольш часта выкарыстоўваюцца. Такая аналітычная інфармацыя дае магчымасць рацыянальнага выкарыстання лекавых сродкаў і пры неабходнасці іх карэкціроўкі, — паясняе суразмоўніца.

Важным крокам з'яўляецца забеспячэнне электроннымі рэцэптамі, што вельмі зручна. Для гэтага неабавязкова ісці ў паліклініку, пацыент можа патэлефанаваць і электронны рэцэпт будзе працягнуты і адпраўлены ў аптэку, куды адразу ж можна звярнуцца.

### КАБ ЗМЕНШЫЦЬ ЧЭРГІ

Гродзенская вобласць працуе ў адзінай рэспубліканскай аўтаматызаванай сістэме «Вакцынацыя» і «Эндапратэзаванне». Тут бачныя ўсе пацыенты, якія стаяць у чарзе, напрыклад, на замену сустава. Такі падыход робіць працэс празрыстым і дае дакладны кантроль над сітуацыяй, пры тым вядзецца глыбокі аналіз як цякучай сітуацыі, так і планавання.

Што датычыцца эндапратэзавання пацыентаў (замены суставаў на пратэз), тэмпы аперацый даволі высокія. За 9 месяцаў іх у вобласці выканана 1345, у тым ліку больш за тысячу тазасцегнавых. Напрыклад, у Гродзенскай універсітэцкай клініцы кожны тыдзень робяць 15-17 аперацый па замене суставаў.

— Мы значна скарацілі чэргі, — зазначыў **галоўны ўрач клінікі Сяргей ЛАЗАРЭВІЧ.** — Калі раней пацыенты чакалі сваёй чаргі год-паўтара, цяпер — толькі некалькі месяцаў. Гэтага ўдалося дасягнуць праз пастаянныя пастаўкі пратэзаў, закупкі якіх вядзе Міністэрства аховы здароўя. Пратэзы розных фірмаў, у тым ліку беларуска-кітайскай вытворчасці.

Праводзяцца аперацыі ў двух клініках абласнога цэнтра і чатырох міжраённых, што таксама дазваляе паскорыць ліст чакання пацыента.

### ТЭЛЕМЕДЫЦЫНА Ў ДАПАМОГУ

У склад інфарматызацыі ўваходзіць цэнтр візуальнага выяўлення, які створаны ў Гродзенскай універсітэцкай клініцы. Тут усё высокатэхналагічнае абсталяванне, у прыватнасці МРТ, КТ, аб'яднана ў адзіную сетку. Дыягназ пацыента, які пастаўлены ў раённых клініках, накіроўваецца ў візуальны цэнтр для больш дэтальнага разгляду абласнымі спецыялістамі. Такім чынам вядзецца навучанне маладых спецыялістаў.

Як пазначыла Людміла Кеда, значным набыткам беларускіх медыкаў з'яўляецца тэлемедыцынскае кансультаванне, да якога падключаны ўсе ўстановы Гродзеншчыны. За год тут праводзіцца звыш 30 тысяч кансультацый. Дзякуючы гэтаму пацыенту з глыбінкі не трэба самому ездзіць на прыём у рэспубліканскія цэнтры. Напачатку туды накіроўваюцца заключэнні абласных медыкаў, затым вядзецца абмеркаванне дыягназу са сталічнымі спецыялістамі, якія даюць свае рэкамендацыі. Пасля гэтага робіцца заключэнне аб накіраванні пацыента на лячэнне на рэспубліканскім ці абласным узроўні. Таксама тэлемедыцына эфектыўна працуе ў выпадку экстраннай дапамогі.

Як расказаў **галоўны ўрач Гродзенскага абласнога кардыялагічнага дыспансера Андрэй ЯНУШКА,** урачы цэнтра могуць звязацца з мінскімі і маскоўскімі клінікамі, у сваю чаргу, спецыялісты міжраённага цэнтра могуць атрымаць тэлемедыцынскую кансультацыю з абласным дыспансерам. За апошні час колькасць такіх зваротаў узрасла ў некалькі разоў, што дапамагае персаналу перыферыйных клінік павышаць свой прафесійны ўзровень.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота Віталія СІНІЧКІНА.**

### У тэму

На Гродзеншчыне хуткімі тэмпамі вядзецца будаўніцтва знакавых медыцынскіх аб'ектаў. У першую чаргу гэта гарадская клінічная бальніца па праспекце Я. Купалы, дзе сёлета ў закладцы капсулы браў удзел кіраўнік дзяржавы. Таксама вядзецца будаўніцтва абласнога анкалагічнага цэнтра, аперацыйнага аддзялення кардыяцэнтра, працягваецца рэканструкцыя ўстаноў аховы здароўя ў райцэнтрах. Шэраг аб'ектаў на стадыі праектна-каштарыснай дакументацыі. За 9 месяцаў на будаўніча-рамонтныя работы выдаткавана больш за 90 мільёнаў рублёў. Закуплена амаль паўтары тысячы адзінак медыцынскага абсталявання.


## Извещение о проведении повторных аукционных торгов по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и земельных участков в г. Бресте в частную собственность граждан Республики Беларусь

| № лота | Наименование объекта/ адрес участка | Кадастровый номер | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке зем.- кадастр. док. (руб.) | Ограничения и условия в его использовании | Инженерное обеспечение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в г. Бресте, **переулок Боровой 2-й, 13** и земельный участок | 140100000001023226 | 0,1024 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **136 556,01** (99 128,81 – не завешенный строительством незаконсервированный жилой дом, 37 427,20 – земельный участок) | 27 000,00 | **4 745,14** | 0,0001 га – охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт; 0,0011 га – охранная зона объектов газораспределительной системы (газопровод среднего давления); 0,1024 га – на мелиорируемых (мелиорированных) землях | Существует возможность подключения к системам газоснабжения, водоснабжения, электроснабжения |
| Победитель аукциона обязан возместить затраты в соответствии с Положением о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298 и решением Брестского городского исполнительного комитета от 06.12.2021 г. № 1619 | | | | | | | | | |
| **Размер штрафа** уплачиваемый в случаях, определённых Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220 и Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» от 05.05.2009 г. № 232 | | | | | | | | | **4 000,00 рублей** |
| **Организатор аукционных торгов –** КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» г. Брест, ул. Ленина, 50-23. Контактный телефон 53 81 92 | | | | | **Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № BY73AKBB30127803600111000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код банка AKBBBY2X, УНП 290433924 в срок до 16.00 10.01.2025 г.** | | | | |

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220** и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе**, **обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы, причитающейся за незавершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;

- часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;

- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников);

• подать заявление о государственной регистрации права на не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом и частной собственности на земельный участок в РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в течение двух месяцев со дня подписания протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся;

• в течение одного месяца с момента государственной регистрации получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство одноквартирного жилого дома и нежилых построек на придомовой территории на предоставленном земельном участке;

• разработать, в установленном порядке, проектную документацию на строительство одноквартирного жилого дома;

• представить изготовленную проектную документацию на согласование в Брестский городской исполнительный комитет;

• завершить строительство объекта в сроки, установленные действующим законодательством.

**Аукцион состоится 14 января 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, актовый зал.**
**Заявления на участие в аукционе принимаются с 8.30 20.12.2024 г. до 16.00. 10.01.2025 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50-23.**
**Контактный телефон 53 81 92. Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by, www.brest-region.gov.by и www.gki.gov.by**

# Пластмасавы свет

## Якую шкоду нясе пластыкавае смецце для планеты і чалавека?

**Адной з галоўных экалагічных праблем XXI стагоддзя, маштабаў якой мы пакуль не ўсведамляем, стала паўсюднае забруджванне мікрапластыкам. Ці думаў пра гэта хто-небудзь у сярэдзіне мінулага стагоддзя, калі пластмасы ўваходзілі ва ўжытак па ўсім свеце і здаваліся ўніверсальным і вельмі практычным матэрыялам, прыдатным усюды?**

Навуковых прац аб шкодзе пластыку яшчэ мала — не назапашана дастаткова даных. Загадку для навукоўцаў уяўляе нанапластык, які вакол нас паўсюль. Колькі яго штодзень трапляе ў наш арганізм? Ці можна знізіць яго ўжыванне? Якія краіны і як зарабляюць на пластыку? Пра гэта і іншае размаўляем з **нейрахірургам, навуковым супрацоўнікам аддзялення пухлін галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчыкам кафедры неўралогіі і нейрахірургіі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Гуменам ГАРБАННІДЖАДАМ.**

***— Гумен, з чаго пачыналася гісторыя пластыку?***

— Амерыканскі вучоны Джон Веслі Хайт у 1867 годзе вынайшаў рэчыва, якое атрымлівалі з цэлюлозы, назваўшы яго цэлюлоід. З 1907-га ў гэта рэчыва пачалі дадаваць вугаль, што рабіла яго нашмат больш трывалым. Ужо тады было зразумела, што матэрыял запатрабаваны. А пасля Другой сусветнай вайны, з 1950-х гадоў, рэзка пачала павялічвацца вытворчасць розных відаў пластыку.

***— Калі стала зразумела, што пластык не такі бяспечны, як здавалася?***

— Ужо ў 1990-х гадах мінулага стагоддзя вучоныя дакладна ведалі, што пластык не раскладаецца і застанецца ў навакольным асяроддзі. Яго вытворчасць з году ў год павялічвалася, пакуль у акіянах не пачалі з'яўляцца новыя астравы — з пластыку. Яны збіраюцца за кошт натуральных цячэнняў у акіяне. Іх таўшчыня ў некаторых месцах дасягае трох метраў. Пластык маецца ва ўсіх акіянах, а самая вялікая яго колькасць — у Ціхім. Цяпер у інтэрнэце даступныя нават анлайн-назіранні са спадарожніка, якія паказваюць рух пластыкавых адходаў па акіяне.

Але праблема нашмат глыбей. Калі вучоныя пачалі вывучаць гэтыя астравы, убачылі пластыкавыя бутэлькі, узрост якіх перавышаў 50 гадоў. Вага такіх адходаў — каля 400 тысяч тон. Але гэта ўсяго 1 % ад вырабленага на планеце пластыку. Дзе ж астатні? Так вучоныя сутыкнуліся з мікрапластыкам — яго таўшчыня прыкладна з чалавечы волас. І ён амаль паўсюль у вадзе. Арганізмы рыб і ўсіх іншых жывёл, якія жывуць у акіяне, таксама забіты мікрапластыкам.

Акрамя мікрапластыку, ёсць яшчэ і нанапластык, які ў 50—100 разоў меншы і яго можна ўбачыць толькі пад мікраскопам. Мікрапластык і нанапластык валодаюць уласцівасцямі аэразолю: разам з выпарэннямі вады яны ўзнімаюцца ў паветра і з ападкамі рассейваюцца па ўсёй планеце. Мікрапластык і нанапластык знойдзены на самым высокім пункце планеты — Гімалаях і самым глыбокім месцы акіяна — Марыянскай упадзіне. Няма такога месца, дзе б не было пластыкавага смецця.

**Найбольш распаўсюджаным тыпам пластыкавых адходаў, якія сустракаюцца ў навакольным асяроддзі, з'яўляюцца недакуркі, фільтры якіх утрымліваюць мізэрныя пластыкавыя валокны. Абгорткі ад ежы, пластыкавыя бутэлькі, закруткі ад пластыкавых бутэлек, пластыкавыя пакеты для прадуктаў, пластыкавыя саломінкі і мяшалкі наступныя па распаўсюджанасці.**

Калі мікрапластык, які трапіць у наш арганізм, не ўсмоктваецца ў кішэчнік і праходзіць транзітам, то нанапластык настолькі дробны, што застаецца ўнутры нас. Імунная сістэма ўспрымае яго як чужародны элемент і пачынае атакаваць. З-за гэтага ў людзей узнікаюць розныя алергічныя рэакцыі. І, паколькі наша імунная сістэма пастаянна перагружана барацьбой з нанапластыкам, яна аслабляецца. І не можа паўнацэнна выконваць адну са сваіх найважнейшых задач — распазнаваць і знішчаць ракавыя клеткі, якія ў нас пастаянна ўтвараюцца. Верагоднасць анкалагічнага захворвання павялічваецца, і гэта датычыцца людзей па ўсім свеце. Нанапластык моцна ўплывае на гарманальны фон нашага арганізма, адсюль бясплоддзе і іншыя праблемы.

І нават калі пастарацца, каб наначасціцы не трапілі ў арганізм праз ежу, яны трапяць праз паветра. Шматлікія даследаванні выявілі мікрапластык у арганізме, уключаючы суставы, крывяносныя сасуды, органы і нават мозг. Яго знаходзяць у мацярынскім малацэ і сперматазоідах.



Такім чынам, звалкай пластыку лічацца як уся планета, у тым ліку Сусветны акіян, так і наша цела.

***— Колькі мікрапластыку трапляе ў арганізм чалавека? Якую шкоду ён нясе?***

— Медыцынскі ўніверсітэт Вены нядаўна апублікаваў даследаванне, згодна з якім у страўнікава-кішачны тракт чалавека за тыдзень трапляе прыкладна пяць грамаў пластыкавых часціц. Новае даследаванне з выкарыстаннем машын для фільтрацыі паветра паказвае, што паўсядзённыя дзеянні, такія як складанне сінтэтычнага адзення, ствараюць вакол нас воблака мікрапластыку.

***— Ці можна зменшыць яго ўжыванне?***

— Ёсць розныя рэкамендацыі, напрыклад, як ачышчаць ваду ад нанапластыку. Калі пракіпяціць і правесці дадатковую фільтрацыю, гэта дазваляе выдаліць да 90 % мікрапластыку, а, паколькі мы пастаянна п'ём ваду, астатнія 10 % усё роўна будуць назапашвацца ў арганізме. Дарэчы, даследчыкі з Кітая правялі эксперымент, падчас якога ўстанавілі, што нанапластык утрымліваецца не толькі ў бутыляванай вадзе, але і ў водаправоднай.

Вучоныя шукаюць выйсце, але яго пакуль няма. Прыдумваюць розныя фантастычныя сцэнарыі: стварыць бактэрыі, якія будуць раскладаць пластык; генетычна змяніць вадзяных чарвякоў, каб яны елі часцінкі пластыку і ачышчалі ваду; фільтраваць ваду, паветра. Навукоўцы лічаць, што ў рэшце рэшт на планеце за кошт эвалюцыі застанецца пэўная колькасць людзей з найбольш устойлівымі да нанапластыку арганізмамі.

***— Але ж пластык і перапрацоўваюць...***

— Штогод на планеце вырабляецца каля 400 мільёнаў тон пластыку. Імпарт і перапрацоўка пластыкавых адходаў — прыбытковы бізнес, і многія краіны атрымліваюць вялікія даходы ад гэтага. Напрыклад, Швецыя імпартуе пластыкавыя адходы, іх перапрацоўвае і за кошт гэтага атрымлівае электраэнергію. Краіны другога і трэцяга свету, якія не маюць дастаткова тэхналогій для перапрацоўкі, спальваюць іх ці па-іншаму ўтылізуюць, у выніку ў гэтых краінах вялікая колькасць анкалагічных захворванняў, у тым ліку ў дзяцей, і хвароб дыхальных шляхоў. Але гэтыя краіны працягваюць імпартаваць пластык, бо гэта прыносіць даход.

А вось самыя вялікія экспарцёры пластыкавых адходаў — Германія, Японія, Вялікабрытанія і ЗША. З'яўляюцца і такія краіны, як Кенія і Марока, якія забаранілі пластыкавыя пакеты. Аднак вялікага значэння гэта не мае, бо і без таго выраблена гіганцкая колькасць пластыку. Тут трэба разумець, што ўсе мы жывём на адной планеце, і мікра- і нанапластык трапіць рознымі шляхамі ў паветра ці ваду і вернецца туды, адкуль экспартавалі.

Аднак пластык на сёння — гэта шматмільярдны бізнес. Матэрыял выкарыстоўваецца ўсюды: пачынаючы ад дэталяў аўтамабіляў, заканчваючы ўпакоўкай прадуктаў у нашым халадзільніку. На жаль, калі мы пачынаем штосьці вырабляць, не думаем пра наступствы. І, нават калі будзе вынайдзены новы від пластыку, які будзе раскладацца, усё роўна ў найбліжэйшыя 500 гадоў наначасцінкі нікуды не знікнуць. І гэта яшчэ адно сведчанне таго, што новы сусветны парадак падобны на што заўгодна, акрамя парадку.

*Поўны тэкст чытайце на сайце zviazda.by.*

**Алена КРАВЕЦ.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Осиповичи», 225855, Брестская обл., Дрогичинский р-н, д. Осиповичи, ул. Советская, д. 17 |

| Предмет электронных торгов | Начальная цена, бел. руб. |
|---|---|
| **Лот № 1 – Жилой дом** (здание одноквартирного жилого дома), инв. номер 121/С-17954, общей площадью 70,7 кв. м, по адресу: Брестская обл., Дрогичинский р-н, Антопольский с/с, д. Новосёлки, ул. Новая, 2<br>Составные части и принадлежности: пристройка, сарай | **3 870,49 (без НДС) Снижение на 50 %** |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 122080205201000057:** предоставлен на праве аренды по 02.04.2043 г., общей площадью 0,2500 га, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | |
| **Лот № 2 – Жилой дом** (здание одноквартирного жилого дома), инв. номер 121/С-17953, общей площадью 70,2 кв. м, по адресу: Брестская обл., Дрогичинский р-н, Антопольский с/с, д. Новосёлки, ул. Новая, 1<br>Составные части и принадлежности: пристройка, сарай, колодец | **3 603,23 (без НДС) Снижение на 50 %** |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 122080205201000056:** предоставлен на праве аренды по 02.04.2043 г., общей площадью 0,2500 га, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | |
| **Лот № 3 – Здание коровника** (здание специализированное животноводства), инв. номер 121/С-17956, общей площадью 1836,3 кв. м, по адресу: Брестская обл., Дрогичинский р-н, Антопольский с/с, 6, 0,2 км западнее д. Новосёлки | **40,00 с НДС 20 %** |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 122080200001000374:** предоставлен на праве постоянного пользования, общей площадью 0,8890 га, для строительства и обслуживания здания коровника | |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившиеся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **8 %** от цены продажи лотов №№ 1–2 и **10 %** от цены продажи лота № 3 в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 24.10.2024 г.

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**: **30.12.2024 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **27.12.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |



**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Лот:** изолированное помещение с инвентарным номером 122/D-8489 (наименование: столовая; назначение: помещение общественного питания), площадью 1647,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. 40 лет Октября, 3А-1

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (с учетом НДС)** | **81 600,00** | **Размер задатка, руб.** | **8 160,00** |

**Продавец:** ОАО «Ивацевичиагротехсервис», 225295, Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. 40 лет Октября, 3, т/ф 80164592143. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./ф 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ №116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** до 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенного договора купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. **Шаг аукциона:** 5 % от предыдущей названной цены

**Аукцион состоится 15 января 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 14 января 2025 г. до 17.00**

# АНЁЛ З НАВАГОДНЯЙ ЁЛКІ

## У Магілёве некалькі дзён працавала фабрыка Дзеда Мароза

**Тым, каму надакучылі штампаваныя ёлачныя цацкі, можна паспрабаваць зрабіць іх самім. Асабліва прыгожымі і незвычайна душэўнымі атрымліваюцца ўпрыгажэнні з ваты. На выгляд яны быццам бы з бабулінага куфра. А яшчэ гэта — цалкам сямейны занятак. Магілёўскі абласны метадцэнтр народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы вырашыў адрадзіць старадаўнюю тэхналогію і запрасіў на семінар клубных работнікаў.**

### Казачны цэх

Цяпер я дакладна ведаю, што такое майстэрня Дзеда Мароза. Адно з памяшканняў метадцэнтра на два дні пераўтварылася ў казачны цэх. Вата, фарбы, ёлкі, бліскаўкі — болей чым 20 чалавек адначасова варажылі над стварэннем калекцыі навагодніх цацак, галоўнай часткай якой стаў анёл.

У якасці ментара — **метадыст метадцэнтра Злата ВОДНЕВА** (на фота). Дзяўчына зусім маладая, а майстрыха ўжо на ўсе рукі: умее вышываць, працаваць з саломкай і глінай. Летась засвоіла тэхналогію ватнай цацкі і, па словах **вядучага метадыста аддзела традыцыйнай мастацкай культуры, народнага майстра Наталлі ДАМЯНІКАВАЙ,** дасягнула вялікіх поспехаў. Семінар яны праводзілі разам. Наталля Дамянікава вельмі задаволена поспехамі сваёй малодшай калегі, кажа, што дзяўчына схоплівае ўсё на ляту. Наталля Вітольдаўна — старшыня Магілёўскага аддзялення Беларускага саюза майстроў, рыхтуе асабліва адораных да прыняцця ў арганізацыю і атрымання статусу «Народны» і добра ведае, што выхаваць спецыяліста ў беларускіх традыцыях няпроста.

— Злата дзяўчына актыўная, дапытлівая, з ёй цікава працаваць, разам вывучылі працэс стварэння ватнай навагодняй цацкі, — удакладняе народны майстар. — Семінар па яе вырабе ў нас упершыню. Усе промыслы, якія калісьці былі на Магілёўшчыне, мы ўжо вывучылі. А вось ватная цацка — нешта новенькае. Нашы майстры зацікавіліся, з некаторых раёнаў прыехалі нават не па адным.

### Цацка з гісторыяй

Наталля Дамянікава заўважае, што сёння ватная навагодняя цацка зноў у трэндзе. За час свайго існавання гэты промысел ужо трэці раз перажывае папулярнасць. З гісторыі вядома, што цацкі з ваты ўпершыню з'явіліся ў 1700 годзе ў Галандыі, потым распаўсюдзіліся на Германію. У сярэдзіне XIX стагоддзя традыцыя перакачавала ў Расію. Ватныя цацкі каштавалі нашмат танней, чым шкляныя, і былі больш даўгавечныя. Кажуць, што маладыя дваранкі засвойвалі навуку вырабу ватнай цацкі падчас знаходжання ў інстытутах шляхетных дзяўчат. Стварэнне цацкі было вельмі модным заняткам. «Варым клейстар. На 1 і 1/2 шклянкі вады бяром 2-3 сталовыя лыжкі крухмалу, даводзім да кіпення, — піша адзін з дамскіх часопісаў пачатку XX стагоддзя. — Затым з дроту робім каркас. Вату дзелім на палоскі, змочваем клейстарам і намотваем на дрот. Яшчэ можна выкарыстоўваць тэхніку пап'е-машэ. Гэта значыць, наляпляць на каркас змочаныя ў клейстары кавалачкі паперы. Замацоўваем усё на каркасе з дапамогай нітак. Сушым цацку два дні. Затым размалёўваем».

Па некаторых звестках, у БССР першая фабрычная ватная цацка з'явілася ў 1954 годзе на Брэсцкай фабрыцы індывідуальнага адзення і абутку «Кастрычніцкая рэвалюцыя». Там адкрыўся цэх дзіцячай цацкі, дзе выраблялiся з фарбаванай ваты пеўнікі, гусі, клоўны і іншае. Сёння гэтыя творы лічацца рарытэтамі.

Суразмоўніца прызнаецца, што некалькі дарагіх яе сэрцу навагодніх упрыгажэнняў з ваты яна захоўвае ў дамашняй калекцыі на працягу доўгіх гадоў.





### Фантазія з ваты

Каб зрабіць сваімі рукамі анёла, спатрэбіцца дрот для каркаса, фольга, вата (ільняная або баваўняная), клейстар з крухмалу, молд у выглядзе твару, акрылавыя фарбы для роспісу і, калі хочацца бляску, паталь або лак. Усё гэта можна набыць у крамах для творчасці або на маркетплейсах.

Кручу дрот, каб сфарміраваць «шкілет» будучай цацкі, і ўважліва слухаю Злату.

— Трэба цалкам абматаць каркас фольгай, прычым шчыльна, каб яна трымалася, — інструктуе дзяўчына. — Затым з дапамогай той жа фольгі створым аб'ём. Не трэба эканоміць на прыгажосці. У анёла павінна быць адпаведная форма. Потым раўнамерна абмотваем выраб ватай: спачатку — тулава, потым — рукі, ногі, шыю, галаву. Трэба, каб было акуратна і захоўваліся прапорцыі. Потым вату замацоўваем ніткай.

Нічога, здаецца, складанага няма. Але ў кагосьці анёл атрымліваецца вельмі тонкім, у кагосьці — вельмі тлустым. Злата ўсіх супакойвае.

Карпею над сваім творам, хочацца, каб быў прыгожы. Злата падбадзёрвае і нагадвае, каб не забылася сагнуць анёлу рукі ў локцях. Так ён выглядае больш натуральна і аптымістычна, чым з апушчанымі рукамі. Асобна робім крылы. У іх аснове — таксама каркас з дроту. Потым на яго намотваюцца фольга і вата. І фігурку, і крылы пакрываем клейстарам і — на прасушку. Калі дэталі падсохнуць, трэба будзе прымацаваць крылы да анёла з дапамогай ніткі. Апошні штрых перад роспісам — замацаваць твар з молду. Прычым не проста прыклеіць, а ўціснуць у канструкцыю так, каб ён не выглядаў пабочным прадметам. Тэхналогія нескладаная, але працэс патрабуе часу, акуратнасці і — творчасці.

За роспіс бяромся, калі цацка цалкам высахла. І тут галоўны прынцып — не нашкодзіць. Анёл — стварэнне пяшчотнае, летуценнае.

— Трэба сесці спакойна і дзень працаваць, — раіць Злата. — Твар не кранаем, бо анёлы бязлікія. Сукенку робім блакітнага колеру. Для гэтага змешваем белую фарбу і крыху сіняй. І дададзім паболей вады, каб надаць адзенню лёгкасці. Акрыл сохне хутка і не сціраецца. Раней, каб выраб блішчэў, яго пакрывалі берталетавай соллю. Цяпер можна зрабіць канцэнтраваны раствор солі з вадой у прапорцыі 3 да 1. Каб падкрэсліць складкі на адзенні, сухім пэндзлем з белай фарбай наносім штрыхі. Валасы адцяняем шэрым колерам — трэба ў белую фарбу дадаць крышачку чорнай. Лёгкі ружовы колер ажывіць рукі.

Дарэчы, калі анёл не атрымаўся, не трэба яго бракаваць. Яго можна пераўтварыць у любога іншага героя. Напрыклад, зрабіць са звычайнай папяровай сурвэткі хустку, і з анёла атрымаецца сялянка-прыгажуня. На сурвэтку трэба нанесці клейстар, каб яна стала цалкам вільготнай, а затым прымацаваць да фігуркі ў выглядзе хусткі, накідкі або чагосьці іншага, на што натхніць фантазія. Калі сурвэтка прыгожая, можна пакінуць усё як ёсць. Калі не вельмі, пакрыйце акрылавай фарбай. І яшчэ некалькі лайфхакаў. Пры дапамозе дробнага пяску або манны можна надаць фігурцы аксаміцістасць. Не забудзьце спачатку пакрыць адзенне вашай нарыхтоўкі клейстарам. У інтэрнэце, дарэчы, можна знайсці яшчэ шмат цікавых парад па гэтай тэме.

Тое, што ватная навагодняя цацка ў трэндзе, паспела пераканацца не адзін раз. **Вольга АНДРЫЯНАВА, загадчыца Краснапольскага Дома рамёстваў,** з якой мы пазнаёміліся на семінары, на адной з нядаўніх выстаў, акрамя лялек, на якіх яна спецыялізуецца, дэманстравала яшчэ і ватныя цацкі. Запэўнівае, што рабіла іх упершыню. Фігуркі з ваты атрымаліся ў яе як на малюнку. Не скажаш, што да семінара яна нават не ведала, як іх рабіць.

— Калі нешта паказалі, лягчэй паўтарыць, — усміхаецца яна. — Раблю адразу партыямі. Пакуль адна лялька сохне, рыхтуеш другую, потым — трэцюю. Твары размалёўваю манікюрным пэндзлем. І дзяцей, якія наведваюць у нашым Доме рамёстваў гуртоК «Майстрыха», вучу. Ім усяго па 8—12 гадоў, і яны ў захапленні.

А літаральна за некалькі тыдняў да Новага года ватнымі цацкамі зацікавіліся кітайскія студэнты, якія вучацца ў Магілёўскім МДУ імя А. Куляшова. Па хадайніцтве ВНУ метадцэнтр арганізаваў для іх адпаведны майстар-клас. Пад кіраўніцтвам прафесіяналаў жыхары Паднябеснай рабілі сувеніры ў выглядзе сімвала будучага года — змяі на шары. У найбліжэйшых планах кітайскіх студэнтаў — праз месенджар азнаёміць сваіх землякоў з гэтай тэхналогіяй, а пасля паказаць серыю майстар-класаў па розных беларускіх рамёствах.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветніцкай дзейнасці.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191 021 390 |
| **Продавец** | ООО «Эковаларана», г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65Б, УНП 193535318 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by)** |
| **Предмет электронного аукциона** | |
| **Здание конюшни** (здание специализированное животноводства, **323,3 кв. м**, 601/С-34237). Адрес: **Минская обл., Логойский р-н, Янушковичский с/с, 22, вблизи д. Бобры** | |
| ***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,7225 га** предоставлен на праве аренды (срок действия: по 12.06.2073 г.) для строительства и обслуживания здания конюшни. Ограничения (обременения): водоохранные зоны рек и водоемов, зона проживания с периодическим радиационным контролем, мелиорируемая земля | |
| **Начальная цена лота без НДС – 610 000,00 бел. руб.** | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять)** календарных дней после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **10 (десяти)** календарных дней после подписания договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах** | |
| Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by.** Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену | |
| Победитель торгов либо единственный участник, согласившиеся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 3 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее, чем за один день до наступления даты проведения аукциона | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 23.01.2025 г. с 12.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Заявки на участие принимаются по 22.01.2025 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| **Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by** | |

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | Могилевский лесхоз, г. Могилев, ул. Крупской, 140. УНП 700336549 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191 224 638. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by. |
| **Предмет электронных торгов – Автобус вагон PAZ P 32053,** р/зн. АЕ 4785-6, 2013 г. в., № кузова Y393205C0D0066081 3205C0D0004625, по адресу: г. Могилев, ул. Крупской, 140 | |
| **Начальная цена, с НДС 20 % – 11 880,00 бел. руб. (снижена на 10 %). Шаг торгов – 594,00 бел. руб.** | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 10.01.2025 г.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **09.01.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by | |
| Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу (http://gki.gov.by) от 16.12.2024 г. | |
| **Контактные телефоны:** +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35. **E-mail:** auction@cpo.by | |

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (Организатор аукциона) по поручению **государственного объединения «Управление бытового обслуживания Минской области»** (Продавец)

**проводит открытый аукцион по продаже**

**ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ № 2 с инв. № 600/D-122704**

**(назначение – помещение бытового обслуживания населения) общей площадью 54,5 кв. м, расположенного по адресу: Минская область, Минский район, Папернянский с/с, аг. Сёмково, ул. Парковая, 1-2.**

**Сведения о земельном участке: кадастровый номер – 623685510601001605, пл. 0,1258 га**
*(доля в праве – 197/1000, общее долевое право аренды по 23.05.2068 г.)*.

Начальная цена без НДС – **52 200,00** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **5 220,00** бел. руб.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (Покупатель) в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня их проведения. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **28.01.2025 г.** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.01.2025 г.** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 8 (029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: 8 (044) 722-03-84.**

УНП 600013293

# БУДУЧЫНЯ — У РУКАХ МАЛАДЫХ

**Петрыкаўскі раён вабіць не толькі маляўнічымі палескімі краявідамі, але і годным узроўнем жыцця. Так, паводле вынікаў мінулага года, ён заняў першае месца ў Гомельскай вобласці па сацыяльна-эканамічным развіцці. І нядзіўна, бо тут вельмі добра разумеюць, што будучыня — у руках маладых.**


Фота БелТА.

— У нас ёсць маладзёжны савет пры Петрыкаўскім раённым савеце дэпутатаў. На гэтае скліканне сабралася вельмі ўдалая каманда на чале са старшынёй Юліяй Ліпскай. Гэта маладыя крэатыўныя людзі, у якіх заўсёды шмат новых ідэй і якія спяшаюцца ўвасобіць іх у жыццё, — падзялілася **начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Петрыкаўскага райвыканкама Святлана БЛІНЕЦ.**

Творчых ініцыятыў шмат, сярод якіх канцэрты, акцыі ды розныя форумы. Так, у раёне праводзіўся шэраг дабрачынных канцэртаў, атрыманыя сродкі ад якіх былі накіраваны на дапамогу пажылым людзям у бальніцах сястрынскага догляду. Да таго ж па ініцыятыве моладзі ва ўстанове «Дзіцяча-юнацкая спартыўная школа» быў рэалізаваны праект «Ідзі і глядзі», у рамках якога адкрылі музей «Легенды спорту Беларусі».

— Важна не губляць кантакт з моладдзю і ўмець знаходзіць з ёй агульную мову. Гэта не так складана, як здаецца. У нас быў досвед правядзення дыялогавай пляцоўкі да Дня народнага адзінства на базе дома-музея дзеда Талаша ў вёсцы Навасёлкі. Мы змаглі не толькі на словах расказаць пра свята, але і паказаць, што ўдзельнікам гэтых мерапрыемстваў быў яшчэ і сам дзед Талаш. Гэта вельмі важна, калі ёсць магчымасць не толькі прачытаць гісторыю, але і дакрануцца да яе. Тады гэта застаецца ў памяці назаўжды, — адзначыла Святлана Міхайлаўна.

А яшчэ ў кастрычніку ў нацыянальным парку «Прыпяцкі» Петрыкаўскага раёна адбыўся фінальны этап маладзёжнага форуму «Моладзь і будучыня», які праходзіў у падпарадкаваных арганізацыях Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта. Тут ён сабраў больш за 200 удзельнікаў з розных куткоў краіны. Яны дапамаглі ліквідаваць наступствы летняга ўрагану і высадзілі новыя дрэвы на плошчы 5,5 га.

**Лізавета ГОЛАД.**

# Новае аблічча храма кнігі

## Брэсцкую абласную бібліятэку імя М. Горкага ўрачыста адкрылі пасля рэканструкцыі

**Брэсцкая абласная бібліятэка толькі на паўтара месяца маладзейшая за Брэсцкую вобласць. 85-ю гадавіну ўстанова будзе адзначаць 27 студзеня 2025 года. Сваю дзейнасць у пасляваенны час бібліятэка аднавіла адразу пасля вызвалення, у жніўні 1944 года. У 1969 годзе абласная бібліятэка пераехала ў трохпавярховы будынак па бульвары Касманаўтаў, дзе знаходзіцца і цяпер. Будынак патрабаваў рэканструкцыі, і аблвыканкам прыняў адпаведнае рашэнне. Толькі ў 2024 годзе на гэтыя патрэбы пайшло 5,3 мільёна рублёў.**

Нездарма падчас адкрыцця бібліятэку неаднойчы называлі храмам кнігі. Цяпер яна выглядае прыгожа як знутры, так і звонку. Асаблівая ўвага падчас рэканструкцыі была аддадзена безбар'ернаму асяроддзю, узведзена прыбудова пад ліфт для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. І, галоўнае, цэнтральны ўваход у бібліятэку перанесены, цяпер з боку вуліцы Кірава, яго не закрываюць дамы, як было раней, з боку бульвара Касманаўтаў.

Спецыялісты ААТ «Палессежылбуд» правялі замену камунікацый, выканалі рамонт аддзела захавання асноўнага фонду. Заменена вентыляцыйная сістэма, сістэма пажаратушэння, устаноўлены сучасныя мабільныя стэлажы.

Павіншаваць з прыемнай падзеяй калектыў бібліятэкі, яе чытачоў прыехаў **старшыня аблвыканкама Пётр ПАРХОМЧЫК.** Кіраўнік рэгіёна адзначыў, што ў выніку праведзенай рэканструкцыі Брэсцкая абласная бібліятэка стала адной з галоўных культурных, інфармацыйных і сацыяльна значных пляцовак горада Брэста і Брэсцкай вобласці.

Кіраўнік вобласці падарыў бібліятэцы сертыфікат на набыццё новай інтэрактыўнай панэлі і калекцыю кніг. А ў адказ атрымаў у падарунак экзэмпляр унікальнага выдання «Песня пра зубра» Міколы Гусоўскага.

Паслугамі бібліятэкі карыстаюцца 37 тысяч чалавек, трэцяя частка іх атрымлівае інфармацыю ў электронным выглядзе. З 2019 года чытачы маюць магчымасць таксама чытаць на сваіх мабільных прыладах электронныя і слухаць аўдыякнігі, сярод якіх — топавыя навінкі літаратуры і бестселеры.

«Бібліятэка ганарыцца сваімі кніжнымі калекцыямі і фондам дакументаў, якія налічвае каля 800 тысяч адзінак захавання. Унікальная калекцыя рэгіянальнай перыёдыкі з 1944 года даступная чытачу», — адзначыла **дырэктар бібліятэкі Алена СТРЫЖЭВІЧ.**

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**


## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего РУПП «Гроднотекстиль»**

**Аукцион состоится 16.01.2025 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

**Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона**

ЛОТ 1:
- Капитальное строение, инв. № 400/С-17193 (назначение – здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий, наименование – главный производственный корпус), площадью 29971,7 кв. м, г. Гродно ул. Максима Горького, 121Г, состоящее из: капитальное строение, инв. № 400/D-152212 (назначение – производственное помещение, наименование – главный производственный корпус), площадью 29418,5 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г-2 и капитальное строение, инв. № 400/D-123114 (назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – помещение неустановленного назначения), площадью 523,0 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г-1;
- капитальное строение, инв. № 400/С-165708 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство), площадью 6813 кв. м, г. Гродно ул. Максима Горького, 121Г, благоустройство;
- капитальное строение, инв. № 400/С-85888 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), протяженностью 586,05 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- капитальное строение, инв. № 400/С-97346 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация), протяженностью 325,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию главного производственного корпуса;
- капитальное строение, инв. № 400/С-89982 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внеплощадочная ливневая канализация), протяженностью 1940,20 м, г. Гродно ул. Максима Горького, 121;
- капитальное строение, инв. № 400/С-165712 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – ливневая канализация), протяженностью 1077,2 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, участки ливневой канализации от здания 121Г;
- капитальное строение, инв. № 400/С-89983 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внеплощадочная напорная канализация), протяженностью 243,80 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- капитальное строение, инв. № 400/С-55845 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внеплощадочная кабельная линия, напряжением 10 кВ), протяженностью 1018 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- капитальное строение, инв. № 400/С-74384 (назначение – сооружение специализированное связи, наименование – внутриплощадочная телефонная канализация), протяженностью 193,20 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- капитальное строение, инв. № 400/С-165711 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), протяженностью 57,3 м, г. Гродно ул. Максима Горького, участки водопроводной сети к зданию 121Г;
- капитальное строение, инв. № 400/С-74876 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный пожарный водопровод), протяженностью 227,80 м, г. Гродно ул. Максима Горького, 121;
- капитальное строение, инв. № 400/С-74877 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный пожарный водопровод), протяженностью 991,36 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- капитальное строение, инв. № 400/С-97384 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная сеть наружного освещения), протяженностью 420,40 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная сеть наружного освещения зданий и сооружений главного производственного корпуса;
- капитальное строение инв. № 400/С-97380 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ), протяженностью 353,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к зданиям и сооружениям главного производственного корпуса;
- капитальное строение, инв. № 400/С-97392 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ), протяженностью 473,70 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ от РП-10 кВ до ТП-1, от ТП-1 до ТП-2;
- капитальное строение, инв. № 400/С-55838 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная напорная канализация), протяженностью 277,25 м, г. Гродно ул. Максима Горького, 121;
- капитальное строение, инв. № 400/С-55842 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный производственный водопровод), протяженностью 1305,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- капитальное строение, инв. № 400/С-85887 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – мостовое сооружение), протяженностью 48,00 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ марки ААБл3*95, протяженностью 155 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- пункты и шкафы распределительные – 67 единиц;
- трансформаторная подстанция – 3 единицы;
- панель ЩО-7024;
- трансформатор масляный – 6 единиц;
- трансформаторные ячейки КРУ-821-00848 – 2 единицы;
- дизель-генератор ДГА-3-48;
- камера КСО – 3 единицы;
- туя – 4 единицы.

Лот № 1 расположен на земельных участках:
- кадастровый номер 440100000002000562, площадью 4,2555 га (назначение – обслуживание зданий и сооружений главного производственного корпуса) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г;
- кадастровый номер 440100000002006864, площадью 0,0078 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- кадастровый номер 440100000002006865, площадью 0,0016 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- кадастровый номер 440100000002006866, площадью 0,0014 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- кадастровый номер 440100000002006867, площадью 0,0073 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121.

Условия проведения аукциона:
- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта;
- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по проведению независимой оценки в размере 2 697 руб.

| | |
|---|---|
| **Начальная цена продажи** | 4 062 220,09 руб. (четыре миллиона шестьдесят две тысячи двести двадцать рублей девять копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 406 222 руб. (четыреста шесть тысяч двести двадцать два рубля) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 14.01.2025 г. до 15.00** |

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 06.04.2024 г.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony



## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Агросервис»

(УНП 700010487, г. Могилев, ул. А. Павлова, 7)

Аукцион состоится **20.01.2025 г. в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352 (офис Организатора аукциона)

Лот № 1: **Изолированное помещение с инв. № 700/D-1599848 – Производственно-бытовой корпус**, назначение: помещение специализированное иного назначения, пл. 2598,00 кв. м, адрес: г. Могилев, ш. Славгородское, 44а.

**22/100 доли капитального строения с инв. № 700/С-117992 – Промышленная площадка для стоянки автомобилей,** назначение: сооружение специализированное транспорта, пл. 17110,5 кв. м, адрес: г. Могилев, ул. Академика Павлова, 7/5.

**Капитальное строение с инв. № 700/С-118290 – Кирпичное ограждение**, назначение: сооружение благоустройства, протяженностью 115,7 м. Адрес: г. Могилев, ул. Академика Павлова, 7/9.

**Ковер напольный**, 2,5х2,5, инв. № 398. **Набор мебели**, инв. № 399. **Сплит-система TCL,** инв. № 2019. **Шкаф,** инв. № 119. **Котел твердотопливный КС-Т-80,** инв. № 656. **Котел твердотопливный КС-Т-80,** инв. № 657. **Холодильный шкаф,** инв. № 84. **Холодильный шкаф,** инв. № 83. **Гарнитур «Кабинет директора»,** инв. № 965. **Стенка встроенная,** инв. № 536. **Электросирена,** инв. № 3111. **Стул,** инв. № 540. **Стул**, инв. № 541. **Стул**, инв. № 542. **Стул**, инв. № 543. **Стул,** инв. № 544. **Стул,** инв. № 549.**Телефакс Panasonic kx-F130,** инв. № 477. **Телефакс Panasonic kx-F131,** инв. № 518. **Телефон Panasonic kx-FPHS**, инв. № 519. **Телефон LX-F130,** инв. № 986. **Весы МК-15.3 – А21**, инв. № 953. **Витрина ВХС-0,28 ТАИР – 1221 (1,5),** инв. № 644. **Мармит,** инв. № 272. **Телефакс,** инв. № 2600. **Терминал Indenico ICT220 GPRS/Ethernet/ Dial-up с выносной клавиатурой д/ввода пин IPP 220 Contractless,** инв. № 963. **Факс,** инв. № 502. **Электронная плитка КЗ-0,5,** инв. № 273. **Электронный котел КПЭ 60,** инв. № 274. **Электроплита ПЭСМ-2,** инв. № 86. **Кассовый аппарат Миника 1102МИк НТС,** инв. № 954. **Кассовый аппарат Миника НТС 11,** инв. № 500002. **Кресло тканевое** – 1 шт. **Стул кожаный** – 1 шт. **Обогреватель** – 1 шт. **Обогреватель** – 3 шт. **Обогреватель** – 1 шт. **Огнетушитель** – 2 шт. **ОП-4(з) Огнетушитель** – 3 шт. **ОП-8 (з) Огнетушитель** – 10 шт. **Огнетушитель** – 1 шт. **Огнетушитель** – 2 шт. **ОП-5** – 1 шт. **Радиоприемник** б/у – 1 шт. **Радиоприемник** – 1 шт. **План эвакуации на ПВХ 300мм*400мм** – 3 шт. **Флаг государственный 0,75*1,5мм** – 1 шт. **Чайник эл**. – 1 шт. **Чайник электрический Aresa K-1801** – 1 шт. **Электрочайник Scarlett SC-EK-21S59 Stell** – 1 шт. **Шкаф двухстворчатый** – 2 шт. **Жалюзи вертикальное** 10,66 кв. м – 2 шт. **Часы настенные Scarlett** – 1 шт. **Корзина для мусора** – 1 шт. **Удлинитель** – 1 шт. **Удлинитель с сетевым фильтром 6*5 м с заземлением 10А CCA 3*0.75 600 SH-5W** – 1 шт. **Сетевой фильтр Gembird SPG 3-B-6PP** – 1 шт. **Удлинитель** – 1 шт. **Удлинитель** – 3 шт. **Сетевой фильтр** – 1 шт. **Телефон** – 1 шт. **Сотовый телефон** – 1 шт. **Телефонный аппарат Люкс 301-3** – 1 шт. **Телефон Bg 2831 Step XL*gray Philips xenium** – 1 шт. **Светильник Дельта** – 1 шт. **Светильник настольный** – 1 шт. **Светильник РВО-220 6м** – 1 шт. **Сетевой фильтр Gembird SPG 3-B-6PP** – 1 шт. **Вентилятор напольный** – 1 шт. **Полотно пожарное** – 1 шт. **Рукав пожарный** – 46 м. **Багор пожарный** – 1 шт. **Топор пожарный** – 1 шт. **Лом пожарный** – 1 шт. **Окно ПВХ VEKA:WHS ЭО (Белый/2180*1250/S:2,725)**, 1 шт. **Радиоузел 100У-101**, инв. № 215, 1 шт.

**Начальная цена продажи:**
**1 325 899,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка: 132 589,90 бел. руб.**

Р/с для перечисления задатков BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код платежа 40901. Срок подачи документов до 12.00 17.01.2025 г. Срок подписания договора купли-продажи 10 календарных дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится на условиях договора купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Порядок и сроки внесения задатков, оформления участия в аукционе, перечень подаваемых документов, порядок проведения аукциона, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке Организатора аукциона GOSTORG.BY.

**Доп. информацию можно получить по тел. 8 (029) 624-26-25; Mogilev@ino.by**



**ЗАО «БелБанкротАукцион»,**
организатор торгов по продаже имущества
**КУП «Магазин № 3 г. Несвижа»** (УНП 690298378),
объявляет о проведении **31.12.2024 г. в 09.00**
публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке **bankrot-torg.by**

| Предмет торгов | Начальная стоимость, бел. руб. с НДС |
|---|---|
| Объединенный лот КУП «Магазин № 3 г. Несвиж». (стеллажи, витрины) | 2866,44 |

Полный перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте ЭТП: **bankrot-torg.by.**



**ЗАО «БелБанкротАукцион»,**
организатор торгов по продаже имущества
**ООО «Двери Оптом»** (УНП 692147011),
объявляет о проведении **31.12.2024 г. в 09.00**
публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке **bankrot-torg.by**

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов** | Имущество ООО «Двери Оптом» (двери, арки, панели, планки и др.) |
| **Начальная стоимость** | 53166,75 бел. руб. с НДС |

Полный перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте ЭТП: **bankrot-torg.by.**

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайты в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by | | |
| **Продавец** | ОАО «Беларусьрезинотехника», УНП 700069297, 213829, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102 | | |
| **Первые повторные публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 06.11.2024 в газете «Звязда» № 217 (30351), стр. 12** | | | |
| 1 | **Подъемник с электролебедкой К-1, инв. № 9595, бывший в эксплуатации** | 3 240,00 бел. руб. с учетом НДС | 2 160,00 бел. руб. с учетом НДС |
| 2 | **Люлька строительная ЛЭ-150-120, инв. № 9584, бывшая в эксплуатации** | 3 780,00 бел. руб. с учетом НДС | 2 520,00 бел. руб. с учетом НДС |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг электронных торгов** – 5 % от начальной цены лота. В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by

**Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) календарных дней** со дня подписания протокола о результатах торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов: не позднее 30 (тридцати) календарных дней** со дня проведения торгов. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества, с момента государственной регистрации перехода права собственности органом, осуществляющим государственную регистрацию недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним

**Торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций - Торги», размещенным по адресу: https://iintorgi.by**

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить аукционисту торгов вознаграждение в размере **3 % от цены продажи лота**

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона) по лоту:** 09.01.2025, начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются с 19.12.2024 по 08.01.2025 г. до 16.00

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

ВНИМАНИЮ ПРЕДПРИЯТИЙ, ОРГАНИЗАЦИЙ И ИНДИВИДУАЛЬНЫХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ!

**Комитетом государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета проводятся аукционы по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района**

К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЕТСЯ:

**1) Объекты бывшего в/г, комплекс № 4: бытовой домик АЭР, склад НЗ с подвалом и боксом на 10 м/м, мощение, гараж техники с котельной, площадкой; контрольно-технический пункт парка АЭР, водопроводная сеть, около г. п. Россь, Росского с/с, 39, 39/1-39/3, Волковысского района.**

Начальная цена предмета аукциона – 5 базовых величин.
Размер задатка – 1 базовая величина.

**2) Объекты бывшего в/г, комплекс № 11: медпункт, два здания штаба с пристройкой, объекты благоустройства, по ул. Красноармейской, 51, 51/1, 51/2, в г. п. Россь, Росского с/с, Волковысского района.**

Начальная цена предмета аукциона – 7 базовых величин.
Размер задатка – 1 базовая величина.
Аукцион состоится – **09.01.2025 г. в 11.30.**
Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.
Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **30.12.2024 г. до 16.00**.

**3) Здание цеха по производству клеевой ленты и объекты благоустройства в г. Волковыск, ул. Новопроектная, 1В.**

Начальная цена предмета аукциона – 2 базовые величины.
Размер задатка – 1 базовая величина.

**4) Здание главного корпуса, будка с колодцем, овощехранилище с составными частями в г. Волквыск, ул. Госпитальная, 11/15, 11/16, 11/1.**

Начальная цена предмета аукциона – 3 базовые величины.
Размер задатка – 1 базовая величина.
Аукцион состоится – **09.01.2025 г. в 12.00.**
Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.
Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **30.12.2024 г. до 16.00**.

**5) Здание учебного центра с составными частями и принадлежностями, гараж по ул. Красноармейская, 39, 39/1, г. п. Россь, Росский с/с, Волковысский район.**

Начальная цена предмета аукциона – 2 базовые величины.
Размер задатка – 1 базовая величина.

**6) Здание кухни-столовой с подвалом и террасой, инженерные сети, объекты благоустройства по ул. Красноармейской, 48, г. п. Россь, Росский с/с, Волковысский район.**

Начальная цена предмета аукциона – 5 базовых величин.
Размер задатка – 1 базовая величина.
Аукцион состоится – **14.01.2025 г. в 12.00.**
Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.
Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **08.01.2025 г. до 16.00.**

Подробная информация по телефонам:
в городе Волковыске **8 (01512) 5 13 44, 2 06 03.**
в городе Гродно **8 (0152) 62 39 24, 62 39 31, 62 39 23.**
Дополнительная информация размещена на сайте:
**https://au.nca.by**

УНП 500042135


Ведай нашых!

# Неба для яго было... усім

**«Лёс чалавека», — сярод дарослага насельніцтва, мабыць, не знойдзецца тых, хто не чытаў бы гэтае апавяданне Міхаіла Шолахава, не глядзеў фільм Сяргея Бандарчука. Але не ўсе, магчыма, ведаюць, што прататыпам галоўнага героя быў беларус, праслаўлены лётчык-знішчальнік Рыгор Дольнікаў (на здымку справа).**



Нарадзіўся ён 8 мая 1923 года ў вёсцы Сахараўка Горацкага раёна. Падчас эпідэміі тыфу страціў бацьку і 16-гадовую сястру, стаў галавой сям'і. Пасля сямігодкі скончыў школу фабрычна-заводскага навучання пры паравозным дэпо Мінска, працаваў слесарам на сталічным вагонарамонтным заводзе, вельмі хацеў быць лётчыкам і спраўджваў мару ў сталічным аэраклубе.

У 1940 годзе Рыгор добраахвотна ўступіў у рады Чырвонай Арміі, навучаўся ў Батайскай ваеннай авіяцыйнай школе пілотаў, служыў у 25-м запасным і 494-м знішчальным авіяпалках... З чэрвеня 1943-га — ваяваў лётчыкам 9-й гвардзейскай знішчальнай авіядывізіі 4-й паветранай арміі. Тады ж — досыць рэзкі характарам — атрымаў мянушку Гарачы, якая стала яго пазыўным. У баях над Данбасам лётчык Дольнікаў здзейсніў 35 баявых вылетаў, правёў 16 паветраных баёў, збіў тры варожыя самалёты. А 30 верасня, пратараніўшы самалёт праціўніка, быў паранены, выскачыў з парашутам, у беспрытомным стане трапіў у палон, назваўся Сакаловым.

...На допыт яго прывезлі ў хату, дзе балявалі немцы. Далей — як у вядомым кіно: запар выпіў тры шклянкі гарэлкі.

У пасляваенных мемуарах ён пісаў: «Што ж датычыцца сумненняў у праўдзівасці эпізоду з Сакаловым, то магу пацвердзіць — ні Сакалоў, ні я ў тую хвіліну не ап'янелі: мы пілі пад дулам аўтамата... Ці думаў я тады аб смерці? Вядома, думаў. Пакуль жывы, я гатовы быў біцца з ворагам, толькі б ацалець, выжыць, вярнуцца да сваіх...»

З чацвёртай спробы Рыгору пашчасціла ўцячы з палону, трапіць у партызанскі атрад, а ўрэшце вярнуцца ў 100-ы гвардзейскі авіяполк, дзе ў адным з баёў ён выйшаў пераможцам у сутычцы са шматлікімі нямецкімі самалётамі і быў удастоены ордэна Чырвонага Сцяга. Ваяваў на 1-м і 2-м Украінскіх франтах, удзельнічаў у вызваленні Украіны, Польшчы, Чэхаславакіі... Усяго за гады вайны Рыгор Дольнікаў здзейсніў 160 баявых вылетаў, правёў 42 паветраныя баі, у якіх збіў 15 самалётаў праціўніка. У канцы вайны ён сустрэў будучую жонку — франтавічку Валянціну Чыстову.

...У пасляваенныя гады Рыгор Усцінавіч Дольнікаў скончыў Ваенна-паветраную акадэмію. Камандуючы звяном, эскадрылляй, палком, дывізіяй, корпусам, паветранай арміяй, заставаўся ўсё тым жа Гарачым — любімым многімі пакаленнямі савецкіх авіятараў лётчыкам-знішчальнікам. «Я лятаў амаль сорак гадоў, — успамінаў генерал, — асвоіў амаль сорак відаў самалётаў і верталётаў. Неба для мяне — усё...»

**Мікалай ШАЎЧЭНКА,**
*г. Мінск.*

Рэзананс

# Вёска, якую нам нельга страціць

**...Сёлета, у жніўні, мне пашчасціла наведаць Бацькаўшчыну, так званую малую радзіму. Дабраўся да вёскі, да сваёй хаты — сеў на лавачцы, каб хоць трохі суняць хваляванне ды агледзецца.**

Вуліца, бачу, зусім бязлюдная (не тое што некалі)... На сядзібе злева істотныя змены: Саня, мой хаўруснік па дзіцячых гульнях, побач са старэнькай хатай спрабуе будаваць катэдж. Здалёк відаць, што грошай на яго ў Сані малавата...

Затое быў і застаўся час на футбол: два дыпломы ў чалавека, здавалася б, у людзі выйшаў, а ў вёску — расказвалі — прыедзе, збярэ каманду і разам з дзецьмі ганяе мячык. Той падчас гульні залятае ў суседскі бульбоўнік, футбалісты ходзяць шукаць (здаралася — у прыцемку, навобмацак, пад лаянку гаспадара, якому потым за страту ўраджаю Саня адвозіць два мяхі сваёй адборнай бульбы)...

Яблыкі вяртаць моды не было, а вось лазіць па іх у чужыя сады — была, напэўна, заўсёды, паўсюль. Я, каб лішні раз не трывожыць бацькоў, спаць укладваўся на сене, на вышках. Прачынаўся ад умоўнага сігналу — свісту на мелодыю песні «Люблю мой край, старонку гэту...». Менавіта з ёй мы з Санькам ішлі «на справу».

Хто не лазіў па чужых садах, той, мусіць, ніколі не зразумее ўсёй рамантыкі, якая ў лепшым выпадку магла скончыцца парванымі штанамі.

...Справа ад нашай лаўкі — зарослая быльнягом сядзіба ўжо нябожчыкаў Вацыка і Алены. Гаспадары яны (імёны зменены) былі добрыя, працавітыя... Выпіць, праўда, любілі. Як цяпер перад вачыма іх стол пад вішняй (грэх, казалі, у пагодны дзень есці ў хаце). На стале тым — «бусел» (у нас яшчэ гаварылі «фаўст») — пляшка «пладова-выгаднага» віна, за сталом — сам гаспадар у прадчуванні свята.

Праз катаракту жонка яго амаль нічога не бачыла. У правую руку муж сам укладваў ёй відэлец з закускай, наліваў віна... І Алена адной левай, як той казаў, (ці не па гуку?) беспамылкова «знаходзіла» яго на стале. «Сляпая то сляпая, — смяецца муж, — а чарку бачыць!»

...У трэцяй хаце, не паводдаль, гаспадарыў некалі дзядзька Якаў — жмінда, якіх пашукаць! Сам сабе есці шкадаваў! Аднак і яго мясцовыя дзецюкі «раскруцілі» на пару бутэлек.

У ноч на Купалле справа была. Тады ў вёсцы мала хто спаў: людзі баяліся варажбы, «дзяжурылі» на сваіх падворках. Дзядзька Яша — таксама: ён досыць позна пакінуў свой пост.

Пасля гэтага хлопцы дзвюма жэрдкамі падважылі Яшаву прыбіральню і неяк заперлі яе ў самы канец агарода. Раніцай гаспадар на вуліцу, па патрэбе, а справіць яе няма дзе...

На Яшавы мацюкі паўвуліцы сышлося (і зламысніка тут як тут). Усе разам з дзядзькам абураліся, казалі, што за такое варта «морды набіць», нават падраджаліся дапамагчы ў гэтым!

Дзядзька расчуліўся, але ж спачатку папрасіў вярнуць на месца «шпакоўню». «Хіба за бутэльку»? — завагаўся адзін з хаўруснікаў. Але гаспадар тады дзве праставіў, бо сам бы гэту работу ніколі не зрабіў...

Помню, яшчэ жонка яго са сваёй суседкай пасварылася... Ды каб толькі: аж да бойкі справа дайшла (свіння ўсе грады парыла). А дні праз два ці тры — гляджу і вачам не веру! — сядзяць гэтыя кабеты на лавачцы, «размовы размаўляюць». Свіння, грады, лаянка, бойка — усё забылася.

...Грэх не ўспомніць тут і наша вясковае слоўка «выбірацца». Яно не пра дэпутатаў, нявест ці жаніхоў і не пра бульбу. Яно — пра дапамогу бліжняму, бо ў нас гэта слова азначала прайсціся па хатах, сабраць сякія-такія грошы (хто колькі дасць) пагарэльцу ці таму, хто трапіў у бяду.

Неяк раз не абмінула яна і нашу сядзібу: прыйшлося дарэзаць рагулю.

Тата, помню, дужа перажываў, але ж неяк яшчэ трымаўся, а мама ледзь не суткамі плакала (карову недарэмна звалі карміцелькай), аж пакуль праз колькі дзён валанцёры (кажучы сённяшняй моваю) не прынеслі ў хату ладнае сіта грошай, не высыпалі на стол рублі, траякі, пяцёркі...

Увосень мы купілі карову.

...На што збірала грошы цётка Антоля, дакладна не ведаю, але ж хавала іх (не тое ад зладзеяў, не тое ад мужа — каб не траціў на выпіўку) у... грубцы. Лета было гарачае, у печы ніхто не паліў, але ж у нейкі дзень моцна пахаладала і задажджыла. Муж, напэўна, уявіў, як жонка — мокрая, змерзлая — прыйдзе з работы і захацеў парадаваць яе — нагрэць у хаце.

Казалі, што грошай вельмі шмат згарэла! Цётка, бедная, на грані вар'яцтва была... Да яго, крый бог, магло б і дайсці, калі б не завядзёнка выбірацца.

...Во колькі дум-успамінаў навеяў звяздоўскі «Нефармат» (гл. нумар за 13.11 г.г.) «Ад спажывання да адчужэння — адзін крок?». Святлана Яскевіч чыстую праўду піша: мы, людзі сталага веку, помнім і голад, і холад, і школьныя ўрокі пры газавых лямпах, і бацькоўскія пустыя працадні, і кукурузны хлеб, і «эру» татальнага дэфіцыту, і чэргі, чэргі, чэргі... Нашым унукам не зразумець, што гэта такое. Ды што ўнукам — маім дзецям цяжка паверыць, што на ўсю нашу вёску, на паўтары тысячы насельніцтва (!) быў адзін тэлефон у калгаснага брыгадзіра і толькі два чорна-белыя тэлевізары.

Што сёння? У той жа вёсцы — інтэрнэт, смартфоны, машыны, дамы з усімі выгодамі, даступныя тавары... Толькі плаці — прывязуць дадому... Ад рэкламы проста спасу няма!

І пры гэтым нельга не пагадзіцца са Святланай, з яе трывогай, што мы «...упускаем нешта надзвычай важнае ў плане чалавечых адносін, што ўсюды адчуваецца адчужэнне».

У маёй вёсцы сапраўды шмат закінутых сядзіб, шмат дамоў і хат, скупленых пад дачы. Гаспадары іх вясной адкрываюць сезон, восенню закрываюць. Кажуць, многія з іх якраз тады, два (?!) разы на год, могуць паразмаўляць з суседзямі, з мясцовымі жыхарамі. У іншы час — вароты (?!) і дзверы на замках.

Як выглядае, новыя гаспадары сапраўды становяцца рабамі спажывання: усё нажытае, баючыся страціць, хаваюць за высознымі, глухімі агароджамі і дапамога, лавачкі з іх вячэрнімі пасядзелкамі, паходы «на сяло».

Не хочацца ў гэта верыць, бо, страціўшы вёску, мы разам з ёй і сапраўды страцім «простыя чалавечыя стасункі».

**М. Камароўскі,**
*г. Орша.*

# Крынічка

Выбраць жывую ёлку не так ужо складана, але, каб падоўжыць яе дні ў кватэры, трэба пастарацца. Пры гэтым умовы догляду ссечанага дрэва і ёлкі ў чыгуне адрозніваюцца.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ.



## Як даўжэй захаваць ёлку свежай

Нельга ўносіць ёлку ў цёплы пакой адразу з вуліцы: рэзкія перапады тэмпературы прывядуць да хуткай гібелі. Дайце ёлцы крыху пастаяць на лесвічнай клетцы, балконе або верандзе.

На паштоўках навагоднія ёлкі звычайна стаяць побач з камінам. З рэальнасцю гэта не мае нічога агульнага. Дрэва пажадана размясціць далей ад цяпла.

Гэтак жа, як у жывых кветак, у ёлкі трэба па магчымасці зрабіць свежы зрэз і выдаліць ніжнія галінкі. Каб дрэва доўга не засыхала, трэба забяспечыць яго вадой. Таму класічную крыжавіну рэкамендуецца абкласці вільготнай ватай. Перыядычна вату трэба асвяжаць.

Замест крыжовага фіксатара можна выкарыстоўваць трыногу з рэзервуарам для вады ці вядро з вільготным пяском.

Адпаведна, трэба сачыць за тым, каб пясок не перасыхаў, а вада ў рэзервуары не заканчвалася. Можна проста паставіць ёлку ў ваду: для гэтага падыдзе вядро ці вялікі чыгун для архідэй. Ствол дрэва павінен быць у вадзе на 2-3 сантыметры, не больш. Наліць поўнае вядро вады і на тыдзень забыцца пра паліў не атрымаецца.

Трэба не толькі сачыць за тым, каб ствол заставаўся вільготным, але і апырскваць галінкі з пульверызатара (толькі не пры ўключанай гірляндзе). Для апырсквання падыдзе адталая вада або звычайная водаправодная, але папярэдне адстоеная.

Ваду ў вядры мяняць не трэба, дастаткова своечасова даліваць яе да патрэбнага ўзроўню.

Не перашкодзіць і пажыўны раствор: цукровы, жэлацінавы, раствор аміячнай салетры.

Калі не выкінуць ёлку адразу пасля свят, можна заўважыць, што на ёй з'яўляюцца малюсенькія шышкі. Пры наяўнасці часу і жаданні можна ўкараніць дрэва, гэта значыць дамагчыся з'яўлення каранёў. Гэты працэс патрабуе не толькі цярпення, але і шанцавання. Іглічныя расліны даволі капрызныя. Калі карані не з'явіліся, то блакітная ёлка, нягледзячы на шышкі, скіне іголкі і засохне. Піхта без каранёў, калі працягнуць яе паліваць, застанецца з іголкамі і можа дастаяць да наступнага Новага года.

Апошнім часам папулярнасць набіраюць ёлкі ў чыгуне. Плюсы відавочныя:

— клопат аб прыродзе;
— лёгкасць усталёўкі;
— адсутнасць ігліцы, якая абсыпаецца.

Ёлку ў кадцы трэба паставіць удалечыні ад крыніцы цяпла, але на святле. Паліваць трэба праз дзень (па 2-3 літры вады за раз).

У ацяпляльным памяшканні такая ёлка можа знаходзіцца не даўжэй за два тыдні.

Як толькі святы скончацца, дрэва трэба выставіць на вуліцу ці хаця б на балкон, калі ён не ўцеплены. Каб карані не змерзлі, варта накрыць гаршчок сенам, саломай ці сінтэтычным матэрыялам.

Калі наступіць вясна, ёлку пажадана падкарміць комплексным мінеральным угнаеннем, раствораным у вадзе для паліву. Потым да самых замаразкаў дрэва трэба будзе рэгулярна паліваць. Карлікавыя віды могуць «жыць», напрыклад на балконе.

Раз на два-тры гады ёлку трэба перасаджваць у чыгун дыяметрам, на 2-3 сантыметры большым за папярэдні.

Ёлку высаджваюць і ў адкрыты грунт. Вядома, яна можа не прыжыцца. Але паспрабаваць у любым выпадку варта.

# АЛЁ, НАРОД!..

ВЯСЁЛЫЯ І ЦІКАВЫЯ ГІСТОРЫІ АД ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

Вядучая рубрыкі Валянціна ДОЎНАР.

## РАЙ, ШТО Ў НАС ПАД НАГАМІ

Лішніх пайшчыкаў у фільме «Гараж» праўленне кааператыва «адсейвала» пры дапамозе шапкі. Добры галаўны ўбор: яго, апроч іншага, можна пусціць па крузе...

Але ж для таго, каб размяркоўваць участкі пад дачы, ён быў яўна малаваты. У нашым садовым таварыстве цыдулкі з нумаркамі давялося ссыпаць у рэшата, куды кожны з пачэснага сходу па чарзе засоўваў руку і...

Згадзіцеся, дэмакратычны прынцып, уласцівы канцу 80-х мінулага стагоддзя, бо на пачатку ўсё было б па-іншаму: найлепшыя ўчасткі кіраўніцтва і набліжаныя асобы забралі б для сябе; тыя, што засталіся, дзялілі б астатнія і нават не абураліся, калі б не абвешчаная Гарбачовым перабудова, пры якой меркавалася, што плебеі ў правах сваіх роўныя патрыцыям: гэта значыць, што выцягнуў, тое і твае: узгорак з пясочкам, значыць, узгорак, «плато» з добрай зямелькай, значыць, «плато».




Малюнак Анатоля ГАРМАЗЫ.

...Мне тады вельмі пашанцавала: участак аказаўся якраз на раўніне. Але ж гэта быў толькі пачатак, бо потым, зламаўшы галаву ў думках, з чаго пачаць будаўніцтва (ні цэглы, ні драўніны, ні шыферу, ні дошак было не дастаць), я трапіў у адну будаўнічую кантору і даведаўся, што для выканання гадавога плана ёй трошкі не хапае аб'ёмаў. А таму ў вытворчасць спешна запускаецца з дзясятак гатовых (!) дамкоў для дачнікаў, і калі я паспяшаюся — хуценька ўнясу перадаплату, то адзін з іх магу набыць.

Ці трэба казаць, што я тады ў спешцы ледзь нос не разбіў! І — цуд — недзе праз месяц завёз дамок (агульнай плошчай 15 квадратаў) на дачны ўчастак, сеў на парозе СВАЙГО новага жытла, паставіў ногі на СВАЮ зямлю...

Незабыўны быў момант! Хоць і азмрочаны трывогай (прынамсі, за дамок), бо ён адзін, сірата: ні вартаўнікоў, ні агародыкаў на ўчастках яшчэ не было. А восьрознага жулля...

Праўда, і на гэты раз нам пашчасціла: дамок выстаяў, да таго ж мы на сямейным савеце прыдумалі, як павялічыць яго плошчу і да вясны нават дасталі дошкі для будучага будаўніцтва.

...Іншага месца, каб скласці іх, тады, вядома ж, не было: завёз на ўчастак, злажыў у дамок. На шырыні штабель атрымаўся на палову падлогі, па вышыні — амаль да столі (з паўметра мо заставалася). А далей...

У той дзень я на сваім участку вельмі добра папрацаваў і гэтак жа добра змарыўся: да адправлення электрычкі вырашыў трохі паляжаць. Дзе? Выбару не было: у дамку, на дошках. Мулка, але заснуў.

Ад чаго прачнуўся, ужо не памятаю. У памяці хіба апраметная цемра!

Стаў падымацца — ударыўся галавой. Абмацаў рукамі аб што — нібыта столь?.. З дошак. Хацеў павярнуцца на бок — не атрымалася, бо там сцяна з дошак. Яны ж у мяне пад бокам і за галавой... Усё, карацей, як у Эдгара По ў «Жывымі пахаваных».

Напоўніцу хапіўшы страху, сцяміў такі, чаму апынуўся ў гэтай «скрыні», потым дапяў, што недзе ж павінна быць «яма».

Намацаў яе не адразу... А ўжо колькі шчасця адчуў!

...Не так даўно мы з жонкай зноў з'ездзілі ў свае Аляхновічы — закрылі дачны сезон. А заадно чаго толькі не ўспомнілі: як цягнулі нумаркі з участкамі, як карчавалі хмызняк, як даставалі матэрыялы, будавалі, капалі, садзілі... Часу, грошай, здароўя паклалі шмат, але ж маем цяпер свой уласны куточак раю — што добра, яшчэ пры жыцці.

**Іван Гаральчук,**
*г. Мінск.*

***У вас ёсць свая цікавая гісторыя? Дасылайце! Мы заўжды на сувязі!***
***zvarot@zviazda.by***

## Надвор'е на заўтра

| | | |
|---|---|---|
| МІНСК 748 мм рт.сл. | +4..+5°C | +4..+5°C |
| ВІЦЕБСК 750 мм рт.сл. | +2..+4°C | +3..+4°C |
| МАГІЛЁЎ 750 мм рт.сл. | +3..+4°C | +3..+5°C |
| ГОМЕЛЬ 753 мм рт.сл. | +3..+4°C | +2..+4°C |
| ГРОДНА 752мм рт.сл. | +6..+7°C | +3..+5°C |
| БРЭСТ 754 мм рт.сл. | +4..+6°C | +3..+5°C |

### Месяц

*Поўня 15 снежня.*

*Месяц у сузор'і Льва.*

### Геамагнітныя ўзрушэнні

22 гадз., 01 гадз., 04 гадз., 07 гадз., 10 гадз., 13 гадз., 16 гадз., 19 гадз.

Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура

### ...у суседзяў

МАСКВА +3..+5°C

С.-ПЕЦЯРБУРГ +3..+5°C

## 19 СНЕЖНЯ Даты Падзеі Людзі




**1896** год — у Мінску адкрыта школа рамесных вучняў. Мела тры аддзяленні: слясарна-кавальскае, сталярна-такарнае і ліцейнае. У 1902 годзе пры школе заснавана чыгуналіцейная майстэрня. У 1913-м тут навучаліся 108 вучняў, гадавая плата за навучанне складала 6 рублёў.

**1915** год — беларускі мастак-авангардыст Казімір Малевіч на футурыстычнай выстаўцы «0.10» у Петраградзе ўпершыню апублікаваў 39 сваіх беспрадметных работ, сярод якіх быў і знакаміты «Чорны квадрат». Карціна ўяўляе сабой палатно памерам 79,5 на 79,5 сантыметраў. На ім намаляваны чорны квадрат на белым фоне. Па сцвярджэнні аўтара, яна была напісана ўлетку 1915 года, праца над ёю заняла больш як два месяцы.

**1918** год — нарадзіўся Антон Канстанцінавіч Леанцюк, Герой Савецкага Саюза, ганаровы грамадзянін в. Узляны Пухавіцкага раёна. Удзельнік Парада Перамогі ў Маскве 24 чэрвеня 1945 г. 5 ліпеня 1944 года батарэя пад яго камандаваннем здзейсніла подзвіг у баі за вёску Узляны, за які ўсе 49 гвардзейцаў-артылерыстаў, якія засталіся ў жывых, пасмяротна былі адзначаны дзяржаўнымі ўзнагародамі.




**1906** год — нарадзіўся Леанід Ільіч Брэжнеў, савецкі дзяржаўны і партыйны дзеяч, шматгадовы кіраўнік СССР. У гады знаходжання Брэжнева на найвышэйшых кіруючых пасадах пачалася палітыка разрадкі, СССР удзяляў у так званым хельсінкскім працэсе, былі заключаны савецка-амерыканскія пагадненні аб абмежаванні стратэгічных наступальных узбраенняў. Разам з тым у краіне нарасталі негатыўныя працэсы ў эканоміцы, сацыяльнай і духоўнай сферах жыцця. Пры Брэжневе былі ўведзены савецкія войскі ў Чэхаславакію і Афганістан.

**1915** год — нарадзілася Эдзіт Піяф, сусветна вядомая французская спявачка.

**1933** год — нарадзілася Галіна Волчак, актрыса тэатра і кіно, тэатральны рэжысёр і педагог, мастацкі кіраўнік тэатра «Современник», народная артыстка СССР.

**Калектыў ТАА «БЕЛСУВЯЗЬПРАМ» віншуе кіраўніка БОНДАРА Аляксандра Генадзевіча з днём нараджэння!**

Паважаны Аляксандр Генадзевіч!
Віншуем Вас з днём нараджэння!
У гэты дзень хочацца нагадаць, як моцна мы ўсе паважаем Вашу працу, старанні і дасягненні. Дзякуй за Вашы якасці: справядлівасць, мудрасць, прафесійнае стаўленне і чуйнае кіраўніцтва.



Жадаем Вам сіл, энергіі, здароўя, бадзёрасці духа, пазітыву, кахання і радасці! Няхай поспех будзе заўсёды на Вашым баку!

Цяпер няпросты час, але, як казаў вялікі Генры Форд: «Вы можаце забраць мае заводы, спаліць мае будынкі, адабраць усе мае грошы – але пройдзе крыху часу, і я ўсё аднаўлю, бо мая галава застанецца пры мне».

Аляксандр Генадзевіч, Вы натхняеце нашу каманду! Вы для нас – легенда!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10 722. Індэкс 63850. Зак. № 2856.

Нумар падпісаны ў 19.30 18 снежня 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12